РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЛЮТАГА 2025 г. СЕРАДА № 34 (30422)



# «УСЁ, АБ ЧЫМ ДАМОВІМСЯ, МЫ ВЫКАНАЕМ СВОЕЧАСОВА»

**Прэзідэнт — аб беларуска-лівійскім супрацоўніцтве**

(Працяг на 2-й стар.)

# МЕДЫЦЫНА ВЫСОКІХ ДАСЯГНЕННЯЎ

Менавіта так характарызуюць беларускую медыцыну на міжнародным узроўні, залічваючы поспехі нашых урачоў у скарбонку сусветных дасягненняў. Да нас едуць лячыць цяжкія дыягназы, рабіць складаныя аперацыі нават з перадавых у гэтым плане Ізраіля або Германіі. Але найперш усе наватарскія рашэнні, усе найноўшыя метады лячэння даступныя менавіта жыхарам Беларусі. Мы ўжо прывыклі да гэтага і чарговую навіну аб адкрыцці ці паспяховай аперацыі нашых медыкаў успрымаем як звычайную, не задумваючыся пры гэтым, колькі сіл і сродкаў патрачана дзяржавай, каб было менавіта так, колькі людскіх жыццяў гэта выратуе. Вось, напрыклад, беларускія генетыкі прыдумалі, як выявіць адно з самых складаных дзіцячых захворванняў, лячэнне якога каштуе некалькі мільёнаў долараў, яшчэ на самым пачатку развіцця плода. І лячэнне тады можна будзе пачынаць з першых дзён жыцця немаўляці, калі яшчэ страшны дыягназ вонкава ніяк не праяўляецца, і яно абяцае быць эфектыўным. І не будзе гэтых адчайных аб'яў у метро: «Дапамажыце, дзіця памірае», і будзе больш у краіне Беларусь шчаслівых здаровых грамадзян.





СТАР. 14



ЛЕГЕНДАРНЫ АРТЫСТ ЛЕГЕНДАРНАГА ТЭАТРА...

13

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ПЯЦІГОДКА ЯКАСЦІ

# ЖКГ: СТАЎКА НА МОЛАДЗЬ

**Якасць паслуг у гэтай сферы — у многім пытанне прафесіяналізму**

Стварэнне камфортнага асяроддзя ў вялікіх гарадах і малых населеных пунктах сёння ў ліку ключавых задач, якія стаяць перад краінай. І тут важны ўнёсак кожнага: органаў дзяржаўнай улады, прадпрыемстваў усіх форм уласнасці, грамадзян. Але «галоўныя героі» пяцігодкі добраўпарадкавання — службы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

А дакладней людзі, якія працуюць у сферы ЖКГ. І калі гэта прафесіяналы сваёй справы, то чысціня і эстэтыка на вуліцах гарадоў і вёсак сапраўды становяцца свайго роду нацыянальным брэндам. Сёння ў галіне жыллёва-камунальнай гаспадаркі працуе каля 130 тысяч чалавек, расказвае **дырэктар Дзяржаўнага навучальнага цэнтра падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў «Жылкам» Кацярына ГАРБАЧОВА**.

— Людзі — галоўны рэсурс кожнай галіны эканомікі, — перакананая яна. — Грамадзяне нашай краіны сутыкаюцца з паслугамі ЖКГ штодня, і гэтыя паслугі павінны аказваць кваліфікаваныя спецыялісты.

СТАР. 11

ISSN 1990 — 763X
25034
9 771990 763008



Фота БелТА.

# «УСЁ, АБ ЧЫМ ДАМОВІМСЯ, МЫ ВЫКАНАЕМ СВОЕЧАСОВА»

## Прэзідэнт — аб беларуска-лівійскім супрацоўніцтве

У Палацы Незалежнасці — замежныя госці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з фельдмаршалам і вярхоўным галоўнакамандуючым Лівійскай нацыянальнай арміяй Халіфой Белкасімам Хафтарам. Лівійская дэлегацыя гэтымі днямі знаходзіцца ў нашай краіне з мэтай наладжвання супрацоўніцтва з Беларуссю ў эканамічнай, гуманітарнай і сацыяльнай сферах.

**Я хачу, каб вы ведалі, што мы вельмі добра дасведчаныя аб сітуацыі ў Лівіі. Мы вельмі добра ведаем Лівію. У мяне да вашага народа асаблівае стаўленне, я бываў у Лівіі ў свой час. Вядома, сёння гэта ўжо іншая Лівія. Але вы павінны ведаць, што мы гатовы зрабіць для вас усё, што вы ўбачыце карысная ў Беларусі. Усё, аб чым мы дамовімся сёння, у гэтыя дні, якія вы будзеце ў Беларусі, мы выканаем своечасова.**

«Прашу лічыць, што вы прыехалі да сваіх сяброў, да сябе дадому, — звярнуўся беларускі лідар да замежнага госця. — Шмат пра вас чытаў, шмат чуў, шмат расказвалі мне. Але сустракаюся ўпершыню. Я хачу, каб вы ведалі, што мы вельмі добра дасведчаныя аб сітуацыі ў Лівіі. Мы вельмі добра ведаем Лівію. У мяне да вашага народа асаблівае стаўленне, я бываў у Лівіі ў свой час. Вядома, сёння гэта ўжо іншая Лівія. Але вы павінны ведаць, што мы гатовы зрабіць для вас усё, што вы ўбачыце карысная ў Беларусі. Усё, аб чым мы дамовімся сёння, у гэтыя дні, якія вы будзеце ў Беларусі, мы выканаем своечасова».

Аляксандр Лукашэнка прывітаў таксама ўсіх членаў дэлегацыі і запэўніў, што беларусы гатовыя да сумеснай работы.

Халіфа Хафтар прызнаўся, што пра Аляксандра Лукашэнку чуў шмат добрых слоў. «Мы вельмі рады сустрэцца з вамі, спадар Прэзідэнт. Мы вельмі рады наведваць Беларусь. Вялікі вам дзякуй за запрашэнне», — сказаў ён. Халіфа Хафтар назваў Беларусь краінай міру і спакою. «Мы хочам супрацоўнічаць з вамі, наладжваць узаемныя адносіны на карысць дзвюх краін, на карысць двух народаў. Ваша кіраўніцтва зрабіла Беларусь высокатэхналагічнай краінай у плане ваеннай тэхнікі, у прамысловай сферы, у аграрнай — усё ў вас развіваецца на высокім узроўні», — падкрэсліў фельдмаршал. Па словах Халіфы Хафтара, кожная дзяржава павінна імкнуцца стаць такой спакойнай краінай, як Беларусь. «Нягледзячы на тое што вакол вас вельмі шмат неспакойных кропак, жаданне ў нас вельмі вялікае наладзіць супрацоўніцтва паміж намі на будучыню», — заявіў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

### Важна ўстанавіць і ўмацаваць кантакты ў розных сферах эканомікі

Учора прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА правёў сустрэчу з фельдмаршалам і вярхоўным галоўнакамандуючым Лівійскай нацыянальнай арміяй Халіфой Белкасімам Хафтарам.

**Кіраўнік Саўміна запэўніў яго, што ўрад Беларусі гатовы выканаць усе дамоўленасці, якія былі дасягнуты падчас сустрэчы з Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Лукашэнкам.**

Раман Галоўчанка падкрэсліў, што Беларусь гатова рэалізоўваць узаемавыгадныя праекты ў рамках беларуска-лівійскага эканамічнага супрацоўніцтва:

— Вельмі важна ўстанавіць і ўмацаваць кантакты ў розных сферах эканомікі, рэалізаваць узаемавыгадныя праекты беларуска-лівійскага эканамічнага супрацоўніцтва.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што, нягледзячы на першы візіт у нашу краіну фельдмаршала і вярхоўнага галоўнакамандуючага Лівійскай нацыянальнай арміяй Халіфы Белкасіма Хафтара, візаві мае дастаткова інфармацыі аб патэнцыяле нашай краіны ў сферах прамысловасці, сельскай гаспадаркі, адукацыі і іншых.

— Я ўважліва азнаёміўся з інфармацыяй аб развіцці Лівіі і глыбока захоплены намаганнямі, якія вы прыкладаеце для развіцця краіны, — акцэнтаваў увагу ён.

У ходзе сустрэчы бакі абмеркавалі такія актуальныя кірункі супрацоўніцтва, як харчовая бяспека, прамысловасць, будаўніцтва, геолагаразведка і адукацыя.

МЕРКАВАННЕ

# РАЎНАПРАЎНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА — АСНОВА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ

Прыбыццё ў Мінск фельдмаршала і вярхоўнага галоўнакамандуючага Лівійскай нацыянальнай арміяй Халіфы Белкасіма Хафтара — ніякім чынам не радавая падзея, паколькі падобныя візіты — гэта паказчык рэальнай зацікаўленасці ў сумеснай рабоце і гатоўнасці весці раўнапраўны палітычны дыялог.

Сёння, калі вектар сілы ссоўваецца ў бок Усходу і Поўдня, многія палітыкі пачынаюць успамінаць аб уласных інтарэсах у Азіі і Афрыцы. На шчасце, Беларусь даўно вызначылася з уласнымі прыярытэтамі, на працягу дзесяцігоддзяў працуе з дзяржавамі як «блізкай», так і «далёкай» дугі. Сярод нашых партнёраў — сотні краін, якім мы гатовы аказаць дапамогу і падтрымаць у выпадку неабходнасці. У гэтым сутнасць беларускай шматвектарнай палітыкі, пабудаванай на ўзаемнай павазе і гатоўнасці знаходзіць узаемавыгадныя рашэнні.

Чаму візіт вярхоўнага галоўнакамандуючага Лівіі адметны нават у глабальным кантэксце? Па-першае, гэта найбагацейшая краіна паўночнай Афрыкі, якая мае стратэгічнае геапалітычнае значэнне. Па-другое, гэта дзяржава, разбураная Захадам і ўведзеная ў грамадзянскую вайну ў 2011 годзе. Па-трэцяе, Халіфа Хафтар — гэта аўтарытэтны лівійскі палітык і ваенны дзеяч, які мае рэальную ўладу, з якім лічацца ўсе сілы як у Лівіі, так і за яе межамі. Ён падтрымліваецца Егіптам, Саудаўскай Аравіяй, ААЭ, Расіяй.

Візіт вярхоўнага галоўнакамандуючага Лівійскай нацыянальнай арміяй у Мінск з'яўляецца прыкметай зацікаўленасці ў развіцці двухбаковых адносін. Ва ўмовах сусветнай турбулентнасці менавіта астраўкі стабільнасці, якім з'яўляецца Беларусь, становяцца пунктамі ўсеагульнага прыцягнення. Магутная эканоміка, высокатэхналагічная вытворчасць, харчовая бяспека, рэальны суверэнітэт ствараюць пункты росту і ўзаемадзеяння.

Мэтамі візіту Халіфы Хафтара афіцыйна заяўлены ўзаемадзеянне Лівіі і Беларусі ў гуманітарнай і сацыяльнай сферах, а таксама эканамічнае супрацоўніцтва. Усё гэта ў поўнай меры ўкладваецца ў рамкі інтарэсаў і магчымасцяў бакоў.

Лівія, якая знаходзіцца ва ўмовах вайны, мае патрэбу ў многіх рэчах, якія можа прапанаваць наша дзяржава. Магчымыя экспартныя пазіцыі: сельскагаспадарчая прадукцыя, машыны, абсталяванне, тавары першай неабходнасці, пошукавыя і адукацыйныя паслугі.

Нельга выключаць, што лівійскаму военачальніку будзе цікавы і айчынны вопыт рэфармавання арміі і ваеннай арганізацыі дзяржавы, а таксама патэнцыял беларускага ваенна-прамысловага комплексу па насычэнні воінскіх часцей сучаснымі ўзорамі тэхнікі і ўзбраення. Ужо сёння айчынныя збройнікі працуюць больш як з пяццюдзесяццю краінамі свету, і якасць нашай прадукцыі не выклікае сумненняў.

Сёння на нашай планеце існуе рэальны запыт на бяспеку і стабільнасць, а забяспечыць іх — задача ўлады, якую лепш вырашаць разам.

«Беларусь гатова развіваць супрацоўніцтва з Лівіяй», — заявіў беларускі лідар Аляксандр Лукашэнка, а тое, што ў яго словы не разыходзіцца са справай, ведаюць ва ўсіх кутках свету.

**Мікалай БУЗІН, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, доктар ваенных навук, прафесар.**

ВАЖНАЯ НАВАЦЫЯ

# АЛЬТЭРНАТЫВА І БОЛЬШ ГНУТКІ ПАДЫХОД

**Прэзідэнт падпісаў Закон «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці», якім комплексна ўдасканальваецца крымінальнае і крымінальна-працэсуальнае заканадаўства**

Дакумент яшчэ на стадыі законапраекта атрымаў шырокае грамадскае абмеркаванне. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы была праведзена маштабная работа ва ўсіх рэгіёнах краіны. Змяненні, абумоўленыя індывідуальным падыходам да крымінальнай адказнасці, падтрыманы як зацікаўленымі органамі, так і простымі грамадзянамі.

**У адпаведнасці з законам перагледжаны санкцыі 97 складаў злачынстваў. З іх 65 дапоўнены альтэрнатыўнымі больш мяккімі відамі пакаранняў (24 саставы да цяперашняга часу ўтрымлівалі пазбаўленне волі як адзінае магчымае пакаранне). Яшчэ 32 саставы зменены ў частцы памеру пакаранняў.**

Так, устанаўліваецца, што жанчынам і адзінокім мужчынам, якія выхоўваюць дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў, а таксама непаўналетнім і інвалідам I групы, якія ўпершыню ўчынілі няцяжкія злачынствы, пазбаўленне волі не прызначаецца. Пры гэтым злачынства не павінна ўяўляць вялікай грамадскай небяспекі. У шэрагу выпадкаў гэта правіла прымяняцца не будзе. Напрыклад, пры здзяйсненні злачынстваў экстрэмісцкай накіраванасці або гвалтоўных злачынстваў.

Крымінальныя справы аб парушэнні правілаў дарожнага руху, што пацягнула прычыненне шкоды блізкім сваякам або членам сям'і вінаватага ў ДТЗ, будуць падлягаць узбуджэнню толькі па заяве пацярпелых. Такі падыход заклікаты спрыяць усуведамленаму урэгуляванням канфліктаў.

Таксама законам прадугледжана ўзмацненне процідзеяння кіберзлачыннасці. У адпаведнасці з дакументам магчыма накладанне арышту на грашовыя сродкі, якія з'яўляюцца прадметам злачынства. Гэта дазволіць аператыўна блакіраваць выкрадзеныя сумы на рахунках і забяспечваць іх вяртанне пацярпелым. Замацоўваецца таксама механізм блакіравання нумароў мабільных тэлефонаў, фішынгавых сайтаў, іншых інтэрнэт-рэсурсаў, якія выкарыстоўваюцца зламыснікамі ў злачынных схемах.

Павышаецца абарона правоў непаўналетніх удзельнікаў крымінальнага працэсу. Цяпер удзел педагога, псіхолага будзе абавязковы як пры допыце падлеткаў, так і пры правядзенні з іх удзелам вочнай стаўкі і праверкі паказанняў на месцы.

Акрамя таго, законам прадугледжаны меры, якія дазваляюць судам больш гнутка (праз альтэрнатыўныя пакаранні ў выглядзе арышту і абмежавання волі) падыходзіць да прызначэння пакарання за злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркотыкаў.

Дарэчы, як адзначыў падчас абмеркавання законапраекта **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Андрэй ЛІС**, пашырэнне магчымасці дыферэнцыравана падыходзіць да прызначэння пакарання за такія злачынствы апраўдана. «Пад дзеянне гэтага артыкула трапляюць не толькі закаранелыя злачынцы, але і маладыя людзі, якія не да канца разумеюць, што яны здзяйсняюць», — заўважыў дэпутат. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што замацаванне альтэрнатыўных пазбаўленню волі пакаранняў дае магчымасць судам пры прызначэнні пакаранняў улічваць усе акалічнасці справы, у тым ліку і асобу вінаватага, і ступень грамадскай небяспекі дзеяння. Такім чынам, цяпер заканадаўства будзе больш збалансаваным.

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА** падкрэсліў, што законапраект шырока абмяркоўваўся на ўсіх узроўнях: «Пачынаючы з дыялогавых пляцовак у калектывах, працоўных групах, дзе спецыялісты выказвалі, з аднаго боку, сваё меркаванне, а з другога — прагназавалі і мадэлявалі варыянты развіцця падзей пасля прыняцця гэтага закона». Ён таксама адзначыў, што змяненні тэрмінаў пакарання, увядзенне альтэрнатыўных відаў сведчаць аб сацыяльным падыходзе ў адносінах да людзей як судовых органаў, так і органаў унутраных спраў, сілавых структур і іншых. Пры гэтым Сяргей Хаменка заўважыў, што ў нашай краіне ўзровень злачыннасці адзін з самых нізкіх у краінах СНД.

*Асноўныя палажэнні закона ўступаюць у сілу праз дзесяць дзён пасля афіцыйнага апублікавання.*

*Задача ад Першага*

***«Мы павінны па вопыце савецкага мінулага істотна падняць прэстыж інжынерных прафесій, павысіць статус тых людзей, чыімі рукамі і інтэлектам ствараюцца рэальныя матэрыяльныя каштоўнасці. Інакш усе нашы планы застануцца пустымі паперкамі.»***

*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на вялікай нарадзе аб стане і задачах развіцця прамысловасці. 9 красавіка 2024 г.*

# Інжынер — прафесія будучыні

Цэнтры тэхнікі і творчасці «Інжынер будучыні» адкрыліся адначасова ў шасці тэхнічных ВНУ — у Мінску і ў кожнай з абласцей. Гэта сумесны праект маладых вучоных і студэнцкай моладзі, які падтрымала Міністэрства адукацыі. Стварэнне цэнтраў накіравана на вучняў 9—11 класаў, каб сфарміраваць тэхнічныя кампетэнцыі ў моладзі і паказаць практычную сферу дзейнасці такой прафесіі, як інжынер, у розных галінах народнай гаспадаркі, наблізіць да рэальнай вытворчасці.

У Магілёве такая пляцоўка размясцілася ў новым корпусе № 7 Беларуска-Расійскага ўніверсітэта — там, дзе знаходзяцца 16 найноўшых інавацыйных лабараторый. Выкладчыкі і вучоныя ўніверсітэта не сумняваюцца, што цэнтр стане цікавым для моладзі. Бо гэта тое, што звязана са штучным інтэлектам, робатамі, найноўшымі тэхналогіямі.

— Усё, што нас акружае ў свеце, так ці інакш звязана з інжынернай думкай. Гэта дарогі, дамы, камбайны, малочнатаварныя фермы, сучасныя школы, паліклінікі, тыя ж перадавыя тэхналогіі, — кажа **рэктар БРУ, доктар тэхнічных навук, прафесар Міхаіл ЛУСЦЯНКОЎ**. — Цяпер шмат хто са школьнікаў марыць пра кар'еру праграміста. І нават не ведае, што аснова гэтай прафесіі больш глыбокая і шматвектарная — інжынерная.

Вучоны звяртае ўвагу на тое, што сёння гэта прафесія запатрабаваная ў кожнай галіне. Прэзідэнт адзначае, што навука павінна мець выразны практыка-арыентаваны характар. Цэнтр «Інжынер будучыні» накіраваны якраз на гэта.

Цэнтр напоўнены камп'ютарнай тэхнікай, у далейшым гэта прастора будзе дапаўняцца сучаснымі механізмамі, устройствамі, адпаведнымі праграмамі. Прычым стаўка робіцца не толькі на старшакласнікаў, але і на больш маладшую аўдыторыю. Каб ужо з дзяцінства было жаданне нешта ствараць.

— Мы як ніхто іншы разумеем важнасць падрыхтоўкі інжынерных кадраў для нашай краіны, — рэзюмуе Міхаіл Лусцянкоў. — Ад гэтага залежыць наш тэхналагічны патэнцыял. Падчас сустрэчы Прэзідэнта з рэктарамі ўніверсітэтаў асобна абмяркоўвалася інжынерная адукацыя. Цяпер разглядаецца праект канцэпцыі развіцця інжынернай адукацыі на 2025—2035 гады. І адно з асноўных палажэнняў — не абмяжоўвацца толькі рамкамі ўніверсітэтаў. Інжынерная адукацыя павінна быць шматузроўневай. І першы ўзровень — менавіта ў школах, таму што калі моладзь зацікавіцца тэхнікай, то яна палюбіць фізіку і матэматыку і асэнсавана пойдзе на інжынерныя спецыяльнасці.

Інжынерныя класы адкрытыя ў дзесяці школах Магілёва, у іх навучаецца каля 200 чалавек.

— Запатрабаванасць вельмі вялікая, па спецыяльнасці «Тэхналогія машынабудавання» мы атрымліваем па дзесяць заявак на аднаго чалавека, — адзначае рэктар.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# «АДНОСІНЫ АЗЕРБАЙДЖАНА І БЕЛАРУСІ МОГУЦЬ СЛУЖЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ УЗАЕМАДЗЕЯННЯ ПАМІЖ ПАРЛАМЕНТАМІ»

## Парламенцкая дэлегацыя Беларусі з афіцыйным візітам знаходзіцца ў Азербайджане

Парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй КАЧАНАВАЙ з афіцыйным візітам знаходзіцца ў Азербайджане. Праграма візіту насычаная. І першы яе пункт — сустрэча Наталлі Качанавай і членаў дэлегацыі са старшынёй Мілі Меджліса Азербайджанскай Рэспублікі Сагібай ГАФАРАВАЙ.



**«Перш за ўсё гэта заслуга нашых кіраўнікоў, прэзідэнтаў нашых краін Аляксандра Лукашэнкі і Ільхама Аліева. У іх склаліся добрыя адносіны, якія сёння нацэлены перш за ўсё на карысць нашых краін і нашых народаў. Аляксандр Рыгоравіч заўсёды гаворыць пра Ільхама Гейдаравіча як пра сябра. І калі кіраўнік беларускай дзяржавы наведваў з візітам вашу цудоўную краіну, ён сказаў, што ў нас няма закрытых тэм для зносін, для вырашэння задач на карысць нашых народаў. Перадаю вам словы прывітання ад усяго беларускага народа і ад вашых калег», — адзначыла Наталля Качанава.**

Сагіба Гафарава пагадзілася са сваёй калегай у тым, што вялізным штуршком для адносін паміж краінамі з'яўляюцца адносіны яе прэзідэнтаў Аляксандра Лукашэнкі і Ільхама Аліева. «Шматлікія візіты лідараў нашых краін (афіцыйныя, дзяржаўныя, рабочыя) сведчаць, што працягваецца працэс развіцця сяброўскіх адносін паміж нашымі краінамі. Хачу сказаць, што візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Азербайджан у маі мінулага года яшчэ раз прадэманстраваў сілу і моц дружбы і ўзаемаадносін нашых лідараў, — адзначыла яна. — І хачу яшчэ раз выказаць удзячнасць вам як прадстаўніку парламента Беларусі і ўсім членам дэлегацыі як прадстаўнікам беларускага народа ў тым, што Аляксандр Лукашэнка быў самы першы лідар немусульманскай краіны, які ўпершыню наведаў Карабах». Сагіба Гафарава назвала Беларусь стратэгічным партнёрам для Азербайджана. «Больш за 170 дакументаў падпісана паміж нашымі дзяржавамі. І думаю, гэта лічба будзе павялічвацца», — падкрэсліла старшыня Мілі Меджліса.

Наталля Качанава запэўніла, што беларускі бок нацэлены на канструктыўнае ўзаемадзеянне з Азербайджанам. Яна зрабіла акцэнт на тым, што вельмі важнае і міжпарламенцкае ўзаемадзеянне. «І я шчыра ўдзячная вам за падтрымку, якую вы нам аказваеце на міжнародных пляцоўках. Адносіны Азербайджана і Беларусі могуць служыць прыкладам узаемадзеяння паміж парламентамі, — адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі. — У аснове палітыкі ў нашай краіне, як і ў Азербайджане, — людзі, іх дабрабыт. Таму мы робім усё для таго, каб нашы людзі жылі шчасліва. Наша краіна яшчэ раз паказала, што мы адзіныя ў захаванні той палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне».

**Паводле слоў спікера, Беларусь зацікаўлена развіваць адносіны з Азербайджанам абсалютна па ўсіх кірунках. Гэта датычыцца гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, культурна-гуманітарнай сферы. «Сёлета мы будзем адзначаць 80-годдзе Вялікай Перамогі. Наша старэйшае пакаленне плячо ў плячо адстойвала свабоду і незалежнасць. Мы памятаем сваю гісторыю. Мы ўдзячныя, што вы падтрымліваеце тыя праекты, якія мы арганізоўваем», — сказала Наталля Качанава. У прыклад яна прывяла праект «Цягнік Памяці», у якім удзельнічалі і дзеці з Азербайджана. Яна выказала спадзяванне, што сёлета яны таксама падключацца да гэтага праекта.**

«Мы шчыра рады тым узаемаадносінам, якія склаліся ў нас у гуманітарнай сферы. Дні культуры Беларусі і Азербайджана мы ладзім. Мы шчыра жадаем вам паспяховага правядзення III Гульняў СНД. Нашы спартсмены рыхтуюцца, з вялікім задавальненнем возьмуць удзел у гэтых спаборніцтвах», — адзначыла спікер.

Падчас візіту ў Азербайджан беларуская дэлегацыя таксама будзе ўдзельнічаць у пасяджэнні Выканаўчага савета Азіяцкай парламенцкай асамблеі (АПА), 15-й Пленарнай сесіі Азіяцкай парламенцкай асамблеі. Наталля Качанава правядзе таксама шэраг двухбаковых сустрэч.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

МЕДЫЯПРАСТОРА

# «ПАТРЭБНЫ НОВЫ КАНТЭНТ»

## Задача: аб'ектыўная і поўная інфармацыя аб саюзнай інтэграцыі

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА абмеркаваў днямі з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем МЕЗЕНЦАВЫМ задачы Медыякампаніі Саюзнай дзяржавы.

«Мы ў пастаянным рэжыме абменьваемся інфармацыяй, як ідзе рэалізацыя шэрагу рашэнняў, прынятых нашымі прэзідэнтамі, кіраўнікамі ўрадаў. Сёння абмяркоўваем рашэнне аб стварэнні Медыякампаніі Саюзнай дзяржавы. Гэта рашэнне мае патрэбу ў дынамічнай практычнай рэалізацыі з-за таго, што ранейшы фармат асвятлення саюзнай праблематыкі не задавольвае кіруючыя структуры. Недастаткова інфармацыі для нашых грамадзян аб тым, як рэалізоўваюцца саюзныя праграмы, тыя ці іншыя кірункі. Важна даводзіць гэту інфармацыю да нашых людзей больш аператыўна», — сказаў Ігар Петрышэнка.

Ён таксама павіншаваў дырэктара аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыі «Медыякампанія Саюзнай дзяржавы» Кацятрыну Абрамаву з назначэннем на пасаду. «Гэта вельмі важная, адказная і няпростая работа. Мы ўсе гатовы аказваць усямерную дапамогу і садзейнічанне, каб гэта кампанія ў кароткі тэрмін пачала працаваць», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

**Яшчэ адна тэма сустрэчы — Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». «Расце ўдзел саюзных структур у нашым фестывалі. Гэта мерапрыемства знаходзіць водгук у гледачоў не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. Мы бачым зваротную сувязь і ўлічваем патрэбы нашых гледачоў», — адзначыў Ігар Петрышэнка.**

Асаблівая ўвага ў гутарцы ўдзялялася і рэспубліканскаму свяце «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»). «Свята праводзіцца на беразе Дняпра. Рака звязвае нашы братэрскія славянскія народы. Гэтыя канцэрты заўсёды праходзяць з цеплынёй і душэўнасцю, усё больш і больш прыцягваюць гледачоў», — дадаў віцэ-прэм'ер.

**Ігар Петрышэнка і Дзмітрый Мезенцаў абмеркавалі і падрыхтоўку да святкавання Дня яднання народаў Беларусі і Расіі. Да гэтай даты традыцыйна зацвярджаюцца адпаведныя планы работы ў абедзвюх краінах. «Рэалізуем традыцыйны набор мерапрыемстваў, а таксама паглядзім шырэй, далучаючы да работы моладзь. Яны павінны далей прадаўжаць нашу саюзную інтэграцыю», — зрабіў акцэнт Ігар Петрышэнка.**

Сёлета адзначаецца 80-годдзе Вялікай Перамогі. Вышэйшым дзяржаўным саветам прыняты план па ўрачыстым святкаванні гэтай даты. «Выконваюцца неабходныя работы па Брэсцкай крэпасці-герою — удасканальваем, капітальна рамантуем шэраг аб'ектаў. Што датычыцца святога для нашых гарадоў месца — Буйніцкага поля, у бягучым годзе прадугледжана выдзяленне рэсурсаў для таго, каб сумесна рэалізаваць гэты сапраўды грандыёзны праект», — праінфармаваў віцэ-прэм'ер.

Дзмітрый Мезенцаў у сваю чаргу адзначыў, што актуальнасць інтэграцыйнай работы ўзрастае, колькасць задач павялічваецца, у тым ліку па гуманітарным парадку дня. «Думаем, што мы ўсе разам будзем дапамагаць станаўленню Медыякампаніі Саюзнай дзяржавы. Самае галоўнае, каб людзі ў поўнай меры атрымлівалі аб'ектыўную, маштабную, змястоўную інфармацыю аб саюзнай практыцы, аб нашай гісторыі, аб тых датах, якія патрабуюць уважлівага агляду ў летапісе беларускага і расійскага народаў. Патрэбны новы кантэнт», — падкрэсліў ён.

**Паводле БелТА.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# «ГЭТА СУР'ЁЗНА ДАПАМАГАЕ ВЫХОЎВАЦЬ НАШУ МОЛАДЗЬ»

## Ігар СЕРГЯЕНКА наведаў Цэнтр патрыятычнага выхавання моладзі «Вектар» у Жодзіне

Наведванне Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі «Вектар» у Жодзіне было прымеркавана да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, а таксама да 26-й гадавіны заснавання цэнтра.

**На заканадаўчым узроўні штуршок развіццю такіх цэнтраў, як «Вектар», быў дадзены Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 4 мая 2022 года № 160 «Аб дзейнасці ваенна-патрыятычных клубаў».**

Старшыня Палаты прадстаўнікоў азнаёміўся з дзейнасцю цэнтра і нагадаў, што за чвэрць стагоддзя яго існавання больш за дзве тысячы дзяцей прайшлі тут падрыхтоўку. «Вектар», па словах спікера, служыць выхаванню і навучанню дзяцей. «Дзеці атрымалі тут пэўныя навыкі, загартоўку. Упершыню, пэўна, адчулі тут пачуццё таварыства. І тое, што больш за 150 дзяцей, якія некалі былі часткай гэтага цэнтра, звязалі сваё жыццё са службай ва Узброеных Сілах Беларусі, органах унутраных спраў, Дзяржаўным пагранічным камітэце і іншых сілавых ведамствах, — добры паказчык. Навыкі, якія былі набыты тут, сталі добрай школай», — сказаў Ігар Сергяенка.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што сёння толькі ў Мінскай вобласці функцыянуе каля 150 ваенна-патрыятычных клубаў.**

«Яны аб'ядноўваюць больш як 3,5 тысячы дзяцей, якія прыходзяць не па загадзе,



не па патрабаванні настаўнікаў або бацькоў, а таму, што ім гэта цікава: тут ёсць элементы гульні, ваенная форма, дзяўчаты і хлопцы, у якіх ёсць чаму навучыцца, вопытныя педагогі і ваенныя кіраўнікі», — звярнуў увагу ён.

Экскурсію па цэнтры патрыятычнага выхавання «Вектар» правёў яго заснавальнік і нязменны кіраўнік Ігар Лазараў. Госці наведалі музей цэнтра, зазірнулі ў пакой адпачынку курсантаў, зброевы пакой. Далей іх чакала салдацкая каша, спевы пад гітару і душэўныя размовы з выхаванцамі цэнтра. Па перакананні Ігара Сергяенкі, уся гэта атмасфера спрыяе фарміраванню асобы чалавека-патрыёта.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што клубы ваенна-патрыятычнага выхавання ажыццяўляюць не толькі ідэалагічную, але і прафарыентацыйную работу. «Складана ацаніць карысць. Гэта дае свой плён праз час: у канкрэтных людзях, іх светапоглядзе. Немалаважна таксама тое, што цяжкія падлеткі са складаных сем'яў тут становяцца іншымі, уцягваючыся ў калектыў і займаючыся цікавымі захапленнямі разам з іншымі дзецьмі», — сказаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.**

Ён звярнуў увагу, што ў Жодзіне назапашаны пэўны вопыт такой работы, ёсць чатыры патрыятычныя клубы, задзейнічана і праваслаўная царква. «Гэта сур'ёзна дапамагае выхоўваць нашу моладзь. Напэўна, кожнаму хлопцу сёння цікава надзець форму, выйсці строем, паўдзельнічаць у спаборніцтвах з выкарыстаннем вучэбнай зброі», — падкрэсліў Ігар Сергяенка.

Напрыканцы мерапрыемства ён падзяліўся з журналістамі ўласнымі ўражаннямі ад наведвання цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі.

**«Скажу галоўнае, на што звяртаеш увагу адразу, — на тое, якая тут атмасфера. Адзін кіраўнік, педагог, энтузіяст, былы вайсковец, які цяпер знаходзіцца ў запасе, дваццаць шосты год кіруе гэтым клубам. Праз клуб прайшлі дзве тысячы дзяўчат і хлопцаў. Многія з іх стварылі сем'і і прыходзяць сюды ўжо са сваімі дзецьмі. Самае галоўнае — маладыя людзі пачынаюць тут фарміравацца як асобы. Яны вучацца любові да Радзімы, разумеюць, як сёння можна абараняць Радзіму са зброяй у руках, што для гэтага трэба рабіць, займаюцца фізічнай падрыхтоўкай. Сюды прыходзяць дзеці ад 9 да 16 гадоў. Старэйшыя навучаюць малодшых. На такіх энтузіястах трымаецца ў асноўным гэта сістэма ваенна-патрыятычнай падрыхтоўкі», — адзначыў спікер.**

Пасля наведвання Цэнтра патрыятычнага выхавання дэпутаты Палаты прадстаўнікоў усклалі кветкі да манумента ў гонар савецкай маці-патрыёткі Анастасіі Купрыянавай у Жодзіне.

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота БелТА.**



АКТУАЛЬНА

# ДЗЕЛЯ ДАБРАБЫТУ КРАІНЫ І ЯЕ ГРАМАДЗЯН

## Сучаснае развіццё немагчыма без навукі і яе ўкладу ў эканоміку

Аб гэтым заявіла першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля ПЯТКЕВІЧ у гутарцы з журналістамі па выніках пасяджэння калегіі Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, паведамляе БелТА.

«Думаю, кожны чалавек, нават далёкі ад гэтай сферы, пераканаўся, што сучаснае развіццё немагчыма без навукі. У адрозненне ад многіх былых савецкіх рэспублік, мы захавалі навуковую школу. Кіраўнік дзяржавы каласальную ўвагу ўдзяляе гэтай тэме і прыклаў вялікія намаганні для захавання навукі на працягу гэтых дзесяцігоддзяў. Самая галоўная задача, якую ён ставіць, — аддача ад навукі. Вядома, фундаментальная навука ёсць, будзе і павінна быць, каб служыць асновай для развіцця прыкладной навукі. А прыкладная ўжо забяспечвае аддачу эканоміцы, і гэта работа канверсуецца ў дабрабыт краіны, у дабрабыт нашых грамадзян», — сказала Наталля Пяткевіч.

**Яна падкрэсліла, што навука павінна вырашаць важныя для Беларусі задачы. «У нас ёсць пэўны аб'ём рэсурсаў, якія выдзяляюцца на навуку, і трэба, каб гэтыя грошы ўкладваліся ў прыярытэтныя кірункі, туды, дзе гэта сапраўды патрэбна для краіны. Таму вельмі вялікая роля павінна быць адведзена Дзяржаўнаму камітэту па навуцы і тэхналогіях, які па сваёй кампетэнцыі і функцыянальных абавязках з'яўляецца органам кіравання і каардынацыі развіцця навукі ў краіне. У нас ёсць акадэмічная, галіновая і вузаўская навука. І правільна збалансаваць іх — гэта вялікае ўменне. Вядома, шмат чаго яшчэ трэба будзе зрабіць у гэтым кірунку», — адзначыла першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.**

Таксама яна звярнула ўвагу на важнасць аналітычнай работы. «Трэба не проста каардынаваць, але і абавязкова аналізаваць, што адбываецца ў навуцы. Менавіта ДКНТ мае поўную інфармацыю для таго, што падказваць, куды развівацца», — сказала Наталля Пяткевіч.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторных электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1607. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4. УНП 700016217 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**
Адрес**: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 38а**

**Встроенное офисное помещение 491,1 кв. м** (административно-торговое помещение, инв. номер 710/D-54707).
***Обременение*:** площади помещения сданы в аренду.
Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона.

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 1 197 239,48 бел. руб.**

| № лота | Наименование | Начальная цена лота, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лоты № 2, 3 (месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ш. Минское)** | | |
| **2** | **Сборочный станок для производства автошин с посадочным диаметром 13,14,15 дюймов PCR/LTR 1+2** (инв. № 02662800298) | 1 241 412,34 |
| 3 | **Сборочный станок для производства автошин с посадочным диаметром 13,14,15 дюймов PCR/LTR 1+2,** г. в. 2004, инв. № 02662800299 | **1 366 531,94** |
| **Лоты № 4 – 23 (**месторасположение: **Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1)** | | |
| **4** | **Линия автоматизированная для изготовления обуви из полимерных материалов, модель Л 2/6** (ПРИ, г.Кричев), г. ввода 1988, инв. 449 | 29 487,97 |
| 5 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 1652) | 3 027,67 |
| 6 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 1652/1) | 62 080,27 |
| 7-9 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 1652/2, 1652/4, 1652/5) | 66 948,85 |
| 10 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 1652/3) | 70 093,19 |
| 11,12 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 424, 424/1) | 51 482,24 |
| 13-16 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 426, 426/1, 426/2, 426/3) | 52 162,70 |
| 17 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 549) | 54 084,61 |
| 18 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 551) | 56 284,88 |
| 19 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 551/1) | 56 339,95 |
| 20 | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/P1** (инв. № 551/2) | **56 354,87** |

Начальная цена снижена по лоту № 2 на 40 %, по лотам № 4, 6—20 на 30 %

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводятся за счет покупателя.**

Задаток **10 % от начальной цены предмета аукциона** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. По письменному заявлению покупателя по лоту №1 может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости имущества на срок до 3-х лет с ежемесячной индексацией платежей согласно договору купли-продажи, при первоначальном платеже не менее 20 % от цены продажи, с учетом ранее внесенной суммы задатка.

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» ( ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившиеся повысить начальную цену на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **0,5 % до 10 % от итоговой цены лота** в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов.

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда»: по лотам № 1—4 — 30.08.2024 г., по лотам № 5—20 — 22.11.2023 г.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 18.03.2025 г., с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.03.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by).**

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.**
**Email: auction@cpo.by**



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона)**
извещает о проведении открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Торфопредприятие Глинка»** (Продавец)

Аукцион состоится **26.03.2025 г. в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4

Лот № 1: Изолированное помещение «Ремонтная мастерская»
с инв. № 135/D-5593, площадь 918.0 м². Адрес: Брестская обл., Столинский р-н, Радчицкий с/с, д. Колодное, ул. Заводская, 2-1.
Начальная цена – 2 013 036,79 руб. с учетом НДС.
Задаток – 201 303,67 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – 24.03.2025 г. в 11.00.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9; 8 (017) 324-70-57; 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; gostorg.by. E-mail: torgi@ino.by**


ЕЎРАЗІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

# ПАРАДАК ДНЯ «ПЯЦЁРКІ»

## Нагляд за таварамі і агульны рынак лекавых сродкаў

На 2-м пасяджэнні Савета ЕЭК у рамках Года старшынства Рэспублікі Беларусь у ЕАЭС разгледзяць больш за 20 пытанняў актуальнага парадку «пяцёркі».

Як расказалі ў прэс-службе Мінэканомікі, мерапрыемства адбудзецца 21 лютага ў Маскве. Парадак дня ўключае больш за 20 пытанняў, у ліку якіх выкананне плана мерапрыемстваў па рэалізацыі стратэгічных кірункаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі да 2025 года; рэалізацыя пілотнага праекта па ўкараненні механізма нагляду за таварамі, увезенымі на мытную тэрыторыю Еўразійскага эканамічнага саюза; распрацоўка канцэпцыі развіцця агульнага рынку лекавых сродкаў у рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.

Таксама члены Савета разгледзяць пытанні аб унясенні змяненняў у Палажэнне аб Савеце кіраўнікоў упаўнаважаных органаў у галіне транспарту дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза і мэтазгоднасці збліжэння кваліфікацыйных патрабаванняў па найбольш запатрабаваных прафесіях на рынку працы Еўразійскага эканамічнага саюза і парадку пацвярджэння прафесійных кваліфікацый.

У фокусе ўвагі таксама апынуцца прапановы па гарманізацыі заканадаўства дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў часткі асноўных паняццяў і азначэнняў, якія выкарыстоўваюцца ў сферы рэгулявання рынку каштоўных папер, і ўстанаўлення патрабаванняў да рынкавых пасрэднікаў (брокераў) на рынку каштоўных папер.

# РАЗВІЦЦЁ НА МЕСЦАХ

## Галоўны вынік ініцыятывы «Адзін раён — адзін праект» — новыя вытворчасці і працоўныя месцы ў рэгіёнах

Пра гэта распавёў у інтэрв'ю тэлеканалу «АНТ» намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення інвестыцыйнай і будаўнічай дзейнасці Мінэканомікі Дзмітрый КЛІМЯНКОЎ, паведамляе прэс-служба ведамства.



Па словах спецыяліста, ініцыятыва «Адзін раён — адзін праект» па стане на канец 2024-га ўключала 208 праектаў, з іх 44 ужо завершаны:

— У цэлым за апошнія 3 гады маем 70 «гісторый поспеху» ў 56 рэгіёнах. Створана звыш 2 тысяч працоўных месцаў і прыцягнута каля 2 млрд рублёў інвестыцый. Пры гэтым больш чым у 10 раёнах рэалізавана два і больш вытворчыя праекты. На 2025-ы сфарміраваны пул з 220 праектаў. Іх рэалізацыя прадугледжвае стварэнне 11 тысяч працоўных месцаў і прыцягненне каля 8 мільярдаў рублёў інвестыцый. Гэта даволі значны зачын для сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны, — адзначыў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення.

Прадстаўнік Мінэканомікі таксама прывёў прыклады маштабных праектаў. У іх ліку — стварэнне бройлернага цэха ў Віцебскім раёне, вытворчасць мяккіх сыроў у Калінкавічах, новы дрэваапрацоўчы завод у Свіслацкім раёне і шклозавод у Гродне. Але ёсць і менш буйныя: вытворчасць харчовых араматызатараў у Бешанковіцкім раёне, алеяў — у Глыбоцкім, хлебабулачных вырабаў — у Гомельскім, пластмас — у Буда-Кашалёўскім раёне і шэраг іншых.

— Праекты рэалізоўваюцца на аснове наяўных рэсурсаў і кампетэнцый, з'яўляюцца адначасова імпартазамяшчальнымі і экспартаарыентаванымі. Такім чынам, адначасова вырашаюцца дзве стратэгічныя задачы, спрыяючы ўстойліваму развіццю тэрыторый. Важна, што ўжо практычна палова раёнаў краіны мае па новым вытворчым праекце і рэалізоўваюць дадатковыя інвестпраекты. Ініцыятыва запатрабавана рэгіёнамі і прыносіць важкі вынік, — рэзюмаваў Дзмітрый Клімянкоў.

# З ДАПАМОГАЙ «ЛІЧБЫ»



Працэдуры па выдачы дазволу на допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху могуць ажыццяўляцца ў электронным выглядзе.

Як паведамілі ў Мінтрансе, адміністрацыйныя працэдуры па выдачы і атрыманні дазволу на допуск транспартнага сродку (за выключэннем колавых трактароў, прычэпаў, паўпрычэпаў да іх) да ўдзелу ў дарожным руху ўключаны ў пералік адміністрацыйных працэдур, заявы зацікаўленых асоб па якіх падаюцца ў электроннай форме праз адзіны партал электронных паслуг.

У ведамстве растлумачылі, што гэта рашэнне замацавана адпаведнай пастановай Саўміна.

# УВАГА ДА РЫТЭЙЛУ

Паводле звестак гандлёвага рэестра, на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь пад маркай «Суседзі» працуе больш за 250 гандлёвых аб'ектаў, паведамілі ў прэс-службе профільнага міністэрства.

Тут адзначылі, што кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы, праведзеныя супрацоўнікамі МАРГ у шэрагу гарадоў краіны (Мінску, Магілёве, Віцебску, Лідзе і іншых), сведчаць, што ў 86 % гандлёвых аб'ектаў «Суседзі», падвергнутых маніторынгу, дапускаліся парушэнні дзейнага заканадаўства.

У прыватнасці, устаноўлены факты рэалізацыі тавараў са скончанымі тэрмінамі прыдатнасці, невыкананне абавязковых асартыментных пералікаў, адсутнасці неабходных сродкаў вымярэнняў, інфармацыі для спажыўцоў, неналежнага афармлення цэннікаў і іншыя факты.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
19 лютага 2025 г. № 6 (787)



# ДЗЕ ПАРАДАК, ТАМ І ЛАД

## У Год добраўпарадкавання роля грамадзянскіх ініцыятыў на месцах узрастае

Тэма добраўпарадкавання стала галоўнай на нядаўнім пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі. На ім абмяркоўвалася роля дэпутацкага корпуса ў рэалізацыі задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы, па наведзенні парадку на зямлі і ўладкаванні тэрыторый. Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА адзначыла: «Асаблівую ўвагу дэпутацкаму корпусу трэба ўдзяліць мясцовым ініцыятывам па добраўпарадкаванні. Уцягванне грамадзян у гэты працэс — адна з найважнейшых задач мясцовых Саветаў. Неабходна падтрымліваць і заахвочваць грамадзянскія ініцыятывы, ствараць умовы для актыўнага ўдзелу насельніцтва ў наведзенні парадку як на асобна ўзятых прыдамавых тэрыторыях, так і ў цэлым у сёлах, гарадах, раёнах». Карэспандэнты «МС» пацікавіліся на месцах, якія грамадзянскія ініцыятывы мяркуецца рэалізаваць у Год добраўпарадкавання.



### МІНШЧЫНА: «ДРЭВА ЖАДАННЯЎ» І «АЛІМПІЙСКАЯ ПАЛЯНА»

Мінскім абласным Саветам дэпутатаў быў аб'яўлены адбор грамадзянскіх ініцыятыў, накіраваных на добраўпарадкаванне населеных пунктаў. Усяго на разгляд паступіла больш чым 30 праектаў.

Найлепшыя атрымаюць фінансавую падтрымку на рэалізацыю са сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў. Аднак і сам ініцыятар праекта павінен забяспечыць суфінансаванне — не менш за 10 % ад запытанай сумы, адзначыла **член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ:** «Такія праекты дазваляюць рэалізаваць ідэі, якія прапаноўваюць нашы грамадзяне. Яны звязаны з наведзеннем парадку на зямлі, з добраўпарадкаваннем, з фарміраваннем эстэтыкі населеных пунктаў. Пасля рэалізацыі яны становяцца месцам прыцягнення людзей. Гэта спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі, паркі, скверы, патрыятычныя праекты, якія дазваляюць захаваць памяць аб тых земляках, што ў свой час адсталі Вялікую Перамогу».

**Старшыня Халопеніцкага сельвыканкама Лідзія БАЧЫШЧАВА** прадставіла ініцыятыву па добраўпарадкаванні парку ў гарадскім пасёлку Халопенічы Крупскага раёна.

У рамках ініцыятывы плануецца мадэрнізацыя існуючай сцэны-амфітэатра, устаноўка новых гульнявых комплексаў для дзяцей, стварэнне зоны для варкаўту, а таксама арганізацыя ўваходнай зоны з архітэктурнымі формамі. «Мы разумеем, што сёння парк — не новая ідэя, але ён мае багатую гісторыю. Мясцовыя жыхары гатовыя ўдзельнічаць у суфінансаванні праекта, праяўляючы сваю грамадзянскую пазіцыю. Мы імкнёмся зрабіць нашу малую радзіму яшчэ прыгажэйшай і лепшай», — падкрэсліла Лідзія Бачышчава.

У вёсцы Маркаўшчына Лагойскага раёна развіваецца ўнікальны праект грамадзянскіх ініцыятыў — спартыўная пляцоўка «Алімпійская паляна». Прадстаўляючы ініцыятыву, **жыхарка вёскі Маркаўшчына Паліна КАЎРЫЖНЫХ** падкрэсліла, што праект ужо атрымаў значнае развіццё дзякуючы сумесным намаганням мясцовых жыхароў і ўлад.

У перспектыве праект плануецца развіваць: трэба будзе ўладкаваць агароджы спартыўных зон, устанавіць інфармацыйныя шчыты для бяспекі. Па словах Паліны Каўрыжных, важнасць гэтай работы пацвярджаецца ўжо праведзенымі на пляцоўцы мерапрыемствамі — валейбольнымі турнірамі, дабрачыннымі калядымі святамі і актыўнасцямі для дзяцей.

У аграгарадку Беразінскае Маладзечанскага раёна плануюць добраўпарадкаваць батанічны помнік прыроды — Бярэзінскі парк. У яго добраўпарадкаванне і гатовыя ўкладвацца мясцовыя. Праект пад назвай «Бярэзінскі парк: прыгажосць прыроды, спадчына гісторыі і будучыня» прадставіла **старшыня Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў Людміла КАНАНОВІЧ:** «У рамках праекта плануецца стварэнне сямі новых лакацый: дзіцячай і спартыўнай пляцовак, валейбольнага корта, а таксама канцэртнай зоны з драўлянай ратондай. Адной з арыгінальных задумак стане «Дрэва жаданняў», дзе маладажоны змогуць пакідаць памятныя стужкі. Для старэйшага пакалення арганізуюць сцежку здароўя, якая пасадзейнічае актыўнаму даўгалеццю». Інфармацыйнае напаўненне парку таксама атрымае развіццё. Па словах старшыні райсавета, уздоўж алеі ўстановяць банеры з QR-кодамі, якія вядуць да звестак аб славутасцях, гісторыі сельсавета і вядомых земляках.

### МАГІЛЁЎШЧЫНА: «КВЕТКІ ПЕРАМОГІ» І «ПЛОШЧА ГЕРОЯЎ»

Палыкавіцкая крыніца — адна з найпрыгажэйшых мясцін Магілёўскай вобласці. Гэта помнік прыроды рэспубліканскага значэння з цікавай старадаўняй гісторыяй. Побач з ёй храм у гонар Святой Параскевы Пятніцы, а вакол — цудоўны парк з пешаходнымі сцяжынкамі і зонамі адпачынку. Апошнім часам прыгажосць вакол храма стала, мякка кажучы, страчваць былы лоск. І насельніцтва на чале з дэпутатамі вырашылі зрабіць у Год добраўпарадкавання гэты аб'ект месцам прыкладання сваіх сіл, каб надаць яму годнае аблічча.

— Наспела неабходнасць навесці ў гэтым сакральным месцы парадак, — адзначае **старшыня Магілёўскага райсавета Сяргей ЯРОШЧАНКА.** — Калі храм выглядае цудоўна, то паркавую зону, падыходы да крыніцы надышоў час асвяжыць. Як заўсёды, параіліся з насельніцтвам. Правялі некалькі сходаў у Палыкавіцкім сельсавеце, людзі аднагучна выказаліся за абнаўленне. Яны ўжо ведаюць, што грошы можна прыцягнуць і сваёй ініцыятывай.

Падлічылі, што спатрэбіцца 30 тысяч рублёў. Жыхары сабралі тры тысячы рублёў і выказалі гатоўнасць прыйсці на суботнікі, якія тут плануюцца правесці не адзін.

Ініцыятыва прайшла конкурсны адбор і перамагла. Яна стала адной з дзевяці, што атрымалі грашовую дапамогу ад Асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Усяго на яе прэтэндавала 33 ініцыятывы.

Сярод іншых праектаў, якія ацаніла журы, краснапольскі — «Іх імёнамі названы вуліцы Краснапольшчыны», чавускі — «Рух — гэта жыццё», накіраваны на добраўпарадкаванне парку адпачынку па вуліцы 60 гадоў СССР, шклоўскі праект «Кветкі перамогі», слаўгарадскі — «Сувязь часоў і пакаленняў», бялыніцкі (вёска Вослеўка) — «Памяць захоўваюць жывыя», хоцімскі (аграгарадок Забялышын) — спартыўны праект «Даступны спорт», бабруйская ініцыятыва па рамонце помніка ў гонар воінскіх часцей і злучэнняў, якія праславіліся пры вызваленні горада, па вуліцы Сацыялістычнай, рамонт і добраўпарадкаванне памятнага аб'екта «Плошча Герояў» у Быхаве.

— Сімвалічна, што значная частка праектаў закранула тэму ўвекавечання памяці воінаў-вызваленцаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, — ахарактарызавала ініцыятывы-пераможцы **дырэктар Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Паліна ЦЕРАШКОВА.** — Гэты год адзначаны 80-й гадавінай Вялікай Перамогі і аб'яўлены Годам добраўпарадкавання. І жаданне жыхароў рэалізаваць праекты менавіта такога кірунку сведчыць аб іх актыўнай пазіцыі, неабыякавасці і патрыятычнасці. Знамянальна таксама, што шэраг ініцыятыў накіраваны на ўмацаванне здароўя і здаровага ладу жыцця.

Сёлета на падтрымку грамадзянскіх ініцыятыў будзе накіравана 400 тысяч рублёў. Памер дапамогі залежыць ад агульнай сумы, якая заяўлена ў праекце.

— Гэта вельмі добры механізм у рэалізацыі грамадзянскіх ініцыятыў, — лічыць **старшыня Чавускага райсавета Анатоль МАЦЮЛІН.** — Адчуванне, што ты датычны да чагосьці вельмі важнага і патрэбнага, акрыляе і прымушае яшчэ больш старанна працаваць на карысць малой радзімы. А прысутнасць такой колькасці аднадумцаў згуртоўвае і аб'ядноўвае. Нядаўна адкрылі спартыўную пляцоўку ў аграгарадку Гарбавічы, якую пабудавалі з прыцягненнем сродкаў ад асацыяцыі. Жыхары прыйшлі з настроем, радаваліся святу. Сёлета мы падавалі чатыры праекты, але перамог адзін. Парк, які мы плануем разам з насельніцтвам добраўпарадкаваць, калісьці быў адным з найлепшых куточкаў горада. Адрамантуем сцяжынкі, памяняем ліхтары, лаўкі, зробім зону для прагулак. Добра, што сёння на падтрымку грамадскіх ініцыятыў мы атрымліваем грошы са свайго бюджэту. Людзі разумеюць, што дзяржава таксама клапоціцца пра іх.

### МІНСК: УСЁ НАЙЛЕПШАЕ — ДЗЕЦЯМ

У Мінску на конкурс грамадзянскіх ініцыятыў было пададзена каля 50 праектаў. У выніку пераможцамі вызначаны 14 з іх.

Па словах **старшыні Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцёма ЦУРАНА,** практычна ўсе з ініцыятыў датычацца мадэрнізацыі або абнаўлення дзіцячых пляцовак:

— Усе праекты ўяўляюць сабой прапановы ад насельніцтва па стварэнні дадатковых умоў для дзяцей на дваровых тэрыторыях. Акрамя таго, сярод пераможцаў ёсць ініцыятыва па рэканструкцыі мемарыяльнага знака ў гонар 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў Партызанскім раёне, — адзначыў старшыня Мінгарсавета.

Два з чатырнаццаці праектаў былі прапанаваны Маскоўскім раёнам — устаноўка дзіцячага гульнявога комплексу на прыдамавой тэрыторыі на праспекце газеты «Звязда» і ўстаноўка дзіцячага і спартыўнага абсталявання на прыдамавой тэрыторыі на праспекце Дзяржынскага. Плануецца, што да першага верасня яны будуць рэалізаваны.

**Першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна Сяргей РУБАНАЎ** адзначыў вялікую актыўнасць з боку насельніцтва адносна прапанаваных праектаў. Варта падкрэсліць, што ад агульнага кошту грамадзянскай ініцыятывы не менш за 10 % — долевы ўдзел насельніцтва, усё астатняе кампенсуе і падтрымлівае дзяржаўны бюджэт. Дамоўленасць з насельніцтвам, паводле слоў Сяргея Віктаравіча, ёсць: людзі гатовыя зрабіць унёсак не толькі матэрыяльна, але і выйсці на суботнікі, каб прывесці тэрыторыі ў парадак.

— Будуць удасканалены спартыўныя пляцоўкі, дзіцячыя гульнявыя комплексы. Установім спартыўнае абсталяванне, баскетбольную пляцоўку, месцы для велагаражоў. Агульнымі сіламі з жыхарамі навядзём парадак у дварах. Актыўна будзем прыцягваць моладзь — БРСМ, які таксама выказаў жаданне ўзяць удзел у развіцці гэтых тэрыторый.

**Спецыяліст, які курыруе работу Мірашнічэнкаўскага акруговага савета ТГС № 49 Мінска, Анжаліка ПУЗАНКОВА** паведаміла, што з насельніцтвам за гэты час была праведзена вялікая работа:

— Нам неабходна было знайсці ініцыятыўных грамадзян, якія гатовыя паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні горада, сумеснымі намаганнямі зрабіць яго камфортней. І важна было знайсці тых, хто гатовы ўкласціся ў тым ліку і фінансава, бо па рэгламенце грамадзяне абавязаны ўнесці не менш за 10 % ад кошту. Мы таксама дапамагалі са зборам неабходных для конкурсу дакументаў. Наша задача цяпер — каб грошы былі пералічаны на рахунак для рэалізацыі задуманага. Людзі хочуць, каб у дварах было прыгожа, добраўпарадкавана і зручна. У нашым раёне шмат жылых дамоў, жыхары якіх маюць патрэбу ў сучасных дзіцячых пляцоўках. Увага ўдзяляецца ў тым ліку і азеляненню дваровых тэрыторый. 2025-ы аб'яўлены Годам добраўпарадкавання, таму мы будзем ініцыіраваць, напрыклад, правядзенне суботнікаў, — рэзюмавала яна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**Яна ВАЛАСАЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов **№ 2025.Ч.002.00047** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** ОАО «Знамя индустриализации», 210017, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Гагарина, 11.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. +375 (212) 24-63-12; +375 (29) 510-07-63; e-mail: vcm74@mail.ru; **https://etpvit.by.**

**Дата и время проведения торгов: 10.03.2025 г. в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот №1.** Изолированное помещение

с инв. № 200/D-202473, площадью 5187,90 кв. м, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Гагарина, 11-1 (места общего пользования), назначение – административное помещение, наименование – административное помещение, на подвальном этаже – лестничная клетка 15,5 кв. м; на 1 этаже – лестничная клетка 19,7 кв. м, лестничная клетка 16,6 кв. м, тамбур 7,1 кв. м, бетонное крыльцо 9 кв. м, бетонное крыльцо 3 кв. м), расположенное на земельном участке с кадастровым номером № 240100000001005132, площадью 4 2264 га (общая долевая аренда).

**Объекты недвижимости имеют обременения**: 1. Ипотека, залогодержатель – юридическое лицо, резидент Республики Беларусь – Республиканское унитарное производственно-торговое предприятие «Оршанский льнокомбинат», 2. Договора аренды — № 10 от 01.10.2023 г. действует по 30.09.2026 г., № 10 от 01.07.2021 г. действует по 29.06.2025 г., № 6 от 01.04.2023 г. действует по 31.03.2027 г., № 7 от 17.04.2023 г. действует по 16.04.2026 г., № 8 от 01.07.2023 г. действует по 30.06.2026 г., № 3 от 29.02.2024 г. действует по 28.02.2025 г., № 13 от 08.11.2022 г. действует по 07.11.2024 г.

**Нач. цена: 2 584 000,00 бел. руб. без учета НДС.**
**Задаток: 258 400, 00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 07.03.2025 г. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия электронных торгов**: победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов и утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, расходы Продавца на проведение оценки предмета эл. торгов, оплатить услуги Оператора ЭТП; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения электронных торгов; оплатить за предмет эл. торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375445928209 (Светлана Георгиевна).



## Извещение о проведении открытого аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by** |
| **Продавец** | ООО «ААА Солюшенс», УНП 19297125, г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, ком. 38. |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| **1042** | Дебиторская задолженность ООО «ААА Солюшенс» (с полным списком дебиторов можно ознакомиться на торговой площадке: www.torgi24.by) | **29 796 612,40** |

**расположенный по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, ком. 38.

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота.

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр. Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг».

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов.

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов (участников).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту – не **более 3 950,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов**: **06.03.2025 г.** в 11.00. **Дата и время окончания торгов: 06.03.2025 г.** в 16.00

Для участия в торгах, необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **19.02.2025 г. по 04.03.2025 г.,** с 9.00 до 17.00.

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50, +375 (29) 607-22-87. Email: info@torgi24.by.**


БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# НА ПРЫЁМЕ — АЛІМПІЙСКІ ЧЭМПІЁН

## Да старшыні Мінскага гарсавета людзі ідуць і з сямейнымі, і з грамадскімі пытаннямі



Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН правёў выязны прыём грамадзян у адміністрацыі Фрунзенскага раёна. Карэспандэнты «Звязды» папрысутнічалі на ім і высветлілі, якія праблемы хвалююць сёння жыхароў сталіцы.

Мінчанка, ва ўласнасці якой знаходзіцца аднапакаёвая кватэра, расказала, што свякроў прэтэндуе на жылплошчу, жадаючы засяліць туды сваякоў. Паводле слоў заяўніцы, без яе ведама з кватэры былі выпісаныя двое яе дзяцей, а таксама незразумелым чынам допушчаны памылкі ў копіі пасведчання аб шлюбе грамадзянкі. Цяпер яна хвалюецца, як прывесці дакументы ў парадак і ці можа свавяцка адабраць у яе кватэру.

«Ваша свякроў па заканадаўстве не мае правоў на гэтую кватэру, таму не можа на яе прэтэндаваць, — патлумачыў Арцём Цуран. — Мы возьмем выпіску рэгістрацыі жыхароў з моманту ўводу дома ў эксплуатацыю і зробім запыт у ЗАГС з просьбай праверыць карэктнасць дадзеных пасведчання аб шлюбе, пасля чаго ўсе адказы накіруем вам».

Наступнымі на прыём прыйшлі знакаміты госць — адзін з першых беларускіх алімпійскіх чэмпіёнаў Сяргей Макаранка — і старшыня Мінскай гарадской арганізацыі БГА «Ветэраны фізічнай культуры і спорту» Уладзімір Глебак. Іх цікавіла пытанне фінансавання арганізацыі: як дзейнічаць для атрымання падтрымкі.

«Згодна з Указам № 300, вам можа быць выдзелена спонсарская дапамога. Галоўнае — мець выразныя статутныя мэты, на якія патрэбы будзе накіравана дапамога. Што датычыцца спаборніцтваў і іншых мерапрыемстваў, варта ўзгадніць і ўнесці іх у план упраўлення спорту і турызму. Упэўнены, вам змогуць даць і суддзяў, і базу для спаборніцтваў», — адзначыў Арцём Цуран.

Настаўнік геаграфіі адной са сталічных школ прыйшоў з незвычайным запытам. Разам з вучнямі ён праводзіў даследаванні назваў мінскіх вуліц, пачынаючы з XVI стагоддзя, і прапанаваў іншыя варыянты найменняў з улікам гістарычных асаблівасцяў той ці іншай мясцовасці.

«Тэма вельмі цікавая і можа быць карысной у будучай рабоце. Варта зрабіць аналіз назваў мікрараёнаў у адпаведнасці з іх геаграфічнай прывязкай. Як вы бачыце пэўны квартал, як яго можна назваць. І такія ідэі можна ўзяць у работу ў далейшым», — адзначыў старшыня Мінгарсавета.

Таксама на прыём прыйшоў мінчанін, які паскардзіўся на паводзіны былой жонкі. Яна не дазваляе яму бачыцца з агульным дзіцем і ўсяляк перашкаджае іх зносінам, у тым ліку настройвае супраць бацькі супрацоўнікаў дзіцячага садка, куды ходзіць дзіця. Кіраўнік дэпутацкага корпуса сталіцы даў парады па ўрэгуляванні сітуацыі і дадаў, што накіруе інфармацыю ва ўпраўленне па адукацыі раёна.

«Дэпутацкі прыём трохі адрозніваецца ад прыёму, які праходзіць па месцы жыхарства ў ЖЭУ, органах тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. Людзі прыходзяць сюды з больш сур'ёзнымі праблемамі, якія патрабуюць дэталёвага падыходу. Так ці інакш усе гэтыя пытанні мы разглядаем і будзем падключаць профільныя службы, арганізацыі, якія працуюць у гэтым кірунку, для далейшых сумесных рашэнняў», — падагульніў старшыня Мінгарсавета Арцём Цуран.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

ПЕРАЕМНАСЦЬ ПАКАЛЕННЯЎ

# ПАТРЭБЕН БОЛЬШ ЦЕСНЫ ДЫЯЛОГ

## Пытанні рэгіянальнага ўзаемадзеяння маладзёжных парламентаў абмеркавалі ў Мінску



Сустрэча ў фармаце пасяджэння рабочай групы прайшла ўпершыню. Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі актуальныя пытанні, якія датычацца маладзёжнай палітыкі, развіцця ініцыятыў і праектаў, накіраваных на падтрымку маладых людзей у розных сферах жыцця. Старшыні маладзёжных саветаў і парламентаў падзяліліся гісторыяй развіцця свайго органа, расказалі аб яго структуры, складзе, аб асноўных мерапрыемствах і ініцыятывах, якія рэалізуюцца ў тым ці іншым рэгіёне.

Маладыя актывісты з усёй краіны шукалі шляхі пашырэння актуальных кірункаў работы, паведамляюць «Мінск-навіны». Раней іх супрацоўніцтва насіла хутчэй кропкавы характар. Практыка паказала неабходнасць больш цеснага дыялогу, таму на сустрэчы абмяркоўвалі механізмы рэалізацыі сумесных праектаў. Самым маштабным з іх стане прымеркаваны да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

— Такое мерапрыемства дапаможа яшчэ больш шчыльна і эфектыўна працаваць з маладзёжнымі саветамі ўсіх рэгіёнаў нашай краіны, трымаць руку на пульсе актуальных пытанняў у маладзёжным асяроддзі і, кансалідаваўшыся, выпрацоўваць тыя ці іншыя прапановы. Мы дамовіліся з маладымі парламентарыямі працягваць нашу работу і аб'ядноўваць намаганні па зборы прапаноў сярод членаў маладзёжных саветаў рознага ўзроўню, накіраваных на ўдасканаленне заканадаўства ў сферы маладзёжнай палітыкі, — сказала **старшыня Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Аліна РАЦЬКОВА.**

— Быў зроблены важны крок для развіцця маладзёжнага парламентарызму ў Беларусі. Думаю, распрацоўка дакладнага механізма ўзаемадзеяння паміж усімі рэгіёнамі краіны па пытанні работы маладых парламентарыяў дапаможа выбудаваць сістэму нашай дзейнасці. Калі мы і далей будзем працаваць у такім фармаце, то зможам бачыць праблематыку ў рэгіёнах, а значыць, зможам сумесна вырашаць усе праблемы, якія існуюць у маладзёжным асяроддзі, — выказала меркаванне **старшыня Маладзёжнага парламента пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў Лізавета БАСАЛАЙ.**

Рабочая група стане пастаяннай пляцоўкай для абмеркавання пытанняў рэгіянальнага развіцця маладзёжных парламентаў. Плануецца, што ўдзельнікі будуць збірацца раз на тры месяцы.



ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

# БЫЦЬ У КУРСЕ ЎСЯГО, ШТО ХВАЛЮЕ ЛЮДЗЕЙ

## Якія тэмы былі ў цэнтры ўвагі сенатараў на мінулым тыдні

● Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Алег Румо ў рэжыме відэаканферэнцыі прыняў удзел у каардынацыйнай нарадзе кіраўнікоў парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ у Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Асноўнай тэмай мерапрыемства стала падрыхтоўка да ўдзелу ў 24-м зімовым пасяджэнні ПА АБСЕ ў Вене (Аўстрыйская Рэспубліка). Разгледжаны парадак дня пасяджэння і пытанні каардынацыі знешнепалітычнай дзейнасці парламенцкіх дэлегацый дзяржаў — членаў АДКБ у Парламенцкай Асамблеі АБСЕ.

● Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Цэнтр культуры «Віцебск» Глеб Лапіцкі правёў асабісты прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію. Грамадзяне звярталіся з разнастайнымі пытаннямі ад сферы культуры, добраўпарадкавання прыдамавых тэрыторый да пытанняў грамадзянскага і крымінальнага заканадаўства. «Асабістыя прыёмы грамадзян і прамыя тэлефонныя лініі — гэта найважнейшы інструмент, які забяспечвае жывую сувязь паміж уладай і народам. Мы імкнёмся да адкрытага дыялогу і стараемся дапамагчы кожнаму, хто да нас звяртаецца», — падкрэсліў Глеб Лапіцкі.

● «Прэзідэнт неаднаразова падкрэсліваў, што дзеці — гэта наша галоўная каштоўнасць і ў нашай краіне вельмі шмат робіцца менавіта для іх: даступная адукацыя, сацыяльныя гарантыі, медабслугоўванне, магчымасці для развіцця фізічных, творчых і інтэлектуальных здольнасцяў. Прыемна, што пра гэта не забываюцца і ў родным рэгіёне кіраўніка дзяржавы. Хакейны клуб «Магілёў» ужо не першы раз праяўляе сябе як сацыяльна адказная арганізацыя, і тое свята, якое яны зладзілі для дзяцей, дазволіўшы ім стаць галоўнымі героямі гэтага матча, проста захапляе. Менавіта на такіх мерапрыемствах мы бачым вялізны патэнцыял новага пакалення беларусаў. Ім патрэбная ўсяго толькі нашая падтрымка, каб стаць паспяховымі самім і захаваць такі нашу краіну», — заявіў Дзмітрый Баскаў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. На мінулым тыдні сенатар наведаў тэматычны матч «Хакей вачыма дзяцей» паміж камандамі «Магілёў» і жлобінскім «Металургам».

● Андрэй Сідараў, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральны дырэктар прыватнага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Вітбудтэхмаш» наведаў Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт. Сенатар азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай усіх факультэтаў універсітэта і інавацыйнымі распрацоўкамі навукова-тэхналагічнага парка БНТУ «Палітэхнік», узяў удзел у круглым стале з прафесарска-выкладчыцкім складам і студэнтамі. «Адной з актуальных задач развіцця сучаснай эканомікі з'яўляецца арганізацыя цеснага ўзаемадзеяння ўстаноў адукацыі з прадпрыемствамі-работадаўцамі. Навучанне павінна быць практыка-арыентаваным, каб рыхтаваць кваліфікаваных канкурэнтаздольных выпускнікоў», — адзначыў Андрэй Сідараў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**




# «ГАЛОЎНАЕ — УМЕННЕ СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ»

## Да дэпутата Глеба ГУЛЯНКОВА выбаршчыкі прыходзяць з рознымі пытаннямі: ад добраўпарадкавання тратуара да скаргаў на рэкламу

У склад Аршанска-Дняпроўскай выбарчай акругі № 26 уваходзяць частка Оршы і Барані, пасёлкі Балбасава, Копысь і 13 сельсаветаў Аршанскага раёна. Агульная колькасць выбаршчыкаў — звыш 56 тысяч, таму зона адказнасці ў дэпутата Палаты прадстаўнікоў Глеба Гулянкова вялікая.

Дэпутацкая работа, сапраўды, шматгранная. Аднак на першым месцы, як таго патрабуе сама сутнасць гэтай пасады, застаецца узаемадзеянне з выбаршчыкамі. І хоць аднаго тыдня на месяц для ахопу ўвагай усіх катэгорый грамадзян не хапае, сустрэчы з працоўнымі калектывамі і прыёмы грамадзян дазваляюць парламентарыю заставацца ў курсе падзей.

Падчас асабістых прыёмаў да дэпутата Гулянкова звяртаюцца людзі з традыцыйнымі пытаннямі: работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі, рэгістрацыя нерухомай маёмасці, электраацяпленне прыватных жылых дамоў, работа ўчастковых інспектараў і г. д. «На многія звароты ўдаецца знайсці вырашэнне адразу, але бываюць і такія сітуацыі, калі патрабуецца час. Тым не менш прыемна, што неаднойчы па дапамогу звярталіся людзі не толькі з маёй акругі», — расказвае Глеб Леанідавіч.

У скарбонцы «добрых спраў» дэпутата — звароты, якія ўдалося вырашыць станоўча, — такія прыклады: у Оршы аднавілі водаадводную канаву па завулку Усходняму, расчысцілі ад аварыйных дрэў тэрыторыю могілак у вёсцы Свісцелкі і адрамантавалі дарогу на могілкі ў вёсцы Люціны Зубаўскага сельсавета. Аршанскі райвыканкам прыняў рашэнне аб прыёме безгаспадарчага тратуара ў в. Грышаны Высокаўскага сельсавета ў камунальную ўласнасць Аршанскага раёна, элемент дарожнай сеткі перададзены на ўтрыманне Аршанскай спецаўтабазе.


Фота з адкрытых крыніц.

«Быў цікавы зварот наконт рэкламнага роліка анлайн-гульні, дзе гаварылася аб тым, што ў анлайн-гульні можна выйграць тры мільёны рублёў, якіх хопіць на тры пуцёўкі ў санаторый. Рэклама ўводзіла ў падман грамадзян, і па ўказанні МАРГ цяпер трансляцыя роліка ў тэлеэфіры забаронена», — адзначыў Глеб Гулянкоў.

Неад'емным элементам работы ў акрузе былі і застаюцца сустрэчы з працоўнымі калектывамі, моладдзю, вясковым насельніцтвам. Акрамя аповеду пра дзейнасць Парламента, заканадаўчую работу, на парадку дня Глеба Леанідавіча заўсёды надзённы клопат нашай краіны, тэмы, якімі жыве Беларусь сёння. У аб'яўлены Год добраўпарадкавання дэпутат засяроджвае ўвагу насельніцтва на ўдзеле кожнага ў навядзенні парадку на зямлі. «Вядома, што сіл аднаго чалавека не хопіць на тое, каб добраўпарадкаваць сваю вёску, раён. Аднак калі кожны з нас зробіць прыгажосць на сваім участку, выйдзе на прыборку грамадскіх месцаў, па драбінках будзе збірацца агульная карціна. Таму на сустрэчах з насельніцтвам я імкнуся данесці такую думку: важна пачаць з сябе, а там і другія падцягнуцца», — разважае дэпутат.

Галоўным у сваёй рабоце Глеб Гулянкоў лічыць уменне слухаць і чуць сваіх выбаршчыкаў. «Калі чалавек знайшоў смеласць звярнуцца па дапамогу да дэпутата, гэта значыць, што ён ужо прайшоў некаторыя інстанцыі безвынікова. Таму кожная праблема ці прапанова, з якой звяртаецца чалавек, важная. Як для гэтага канкрэтнага грамадзяніна, так і для рэгіёна ў цэлым. Так і для нас, парламентарыяў, пры распрацоўцы законапраектаў», — заключыў Глеб Леанідавіч.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**


# ИЗВЕЩЕНИЕ

**акционеров открытого акционерного общества «Минсктелекомстрой» о проведении очередного общего (годового) собрания акционеров**

Дата проведения очередного общего (годового) собрания акционеров – **21 марта 2025 года**.

Время начала проведения очередного общего (годового) собрания акционеров – **15.00**.

Место проведения очередного общего (годового) собрания акционеров – **г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, кабинет 326**.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в очередном общем (годовом) собрании акционеров – **17 февраля 2025 года**.

Форма проведения очередного общего (годового) собрания акционеров – **очная**.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

**Вопрос 1.** Об утверждении годового отчета Общества за 2024 год.

**Вопрос 2.** Об утверждении отчета наблюдательного совета Общества за 2024 год.

**Вопрос 3.** Об утверждении отчета ревизионной комиссии о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год и рассмотрении заключения ревизионной комиссии о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год.

**Вопрос 4.** О рассмотрении аудиторского заключения по годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2024 год.

**Вопрос 5.** Об утверждении годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2024 год.

**Вопрос 6.** О распределении чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2024 год.

**Вопрос 7.** О выплате дивидендов в 2025 году.

**Вопрос 8.** Об избрании членов наблюдательного совета Общества.

**Вопрос 3.** Об избрании членов ревизионной комиссии Общества.

**Вопрос 10.** О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

**Порядок регистрации лиц, имеющих право на участие в очередном общем (годовом) собрании акционеров**:

- время регистрации участников очередного общего (годового) собрания акционеров – **с 13.00 до 14.40** в день проведения очередного общего (годового) собрания акционеров;
- руководитель акционера - юридического лица должен предъявить группе регистрации документ, удостоверяющий личность, а также документ, подтверждающий полномочия руководителя – копию контракта, который должен быть передан группе регистрации;
- акционер – физическое лицо должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности, которая должна быть передана группе регистрации.

**Порядок ознакомления с информацией (документами) лицами, имеющими право на участие в очередном общем (годовом) собрании акционеров:**

Информация (документы), подготовленные к очередному общему (годовому) собранию акционеров, могут быть предоставлены акционеру Общества (его представителю) в виде копий документов для ознакомления.

При ознакомлении с информацией (документами), подготовленными к очередному общему (годовому) собранию акционеров, не допускается их фото и (или) видеофиксация, их выдача нарочно.

- руководитель акционера-юридического лица должен предъявить документ, удостоверяющий личность, а также документ, подтверждающий полномочия руководителя – копию контракта, который должен быть передан лицу, определенному директором Общества для выполнения этих функций;
- акционер – физическое лицо должен предъявить документ, удостоверяющий личность;
- представитель акционера (юридического или физического лица) должен предъявить документ, удостоверяющий личность, и оригинал доверенности, который должен быть передан лицу, определенному директором Общества для выполнения этих функций.

С информацией (документами), подготовленными к очередному общему (годовому) собранию акционеров, можно ознакомится в рабочие дни (понедельник – пятница) **с 01 по 20 марта 2025 года включительно, с 14 часов 00 минут до 15.00, по адресу: г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, кабинет юрисконсульта, либо в день проведения собрания 21 марта 2025 года – по месту его проведения**.

УНП 100068131

**Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки" извещает о проведении открытого аукциона**

**Лот № 1:** легковой седан ТОЙОТА АВАЛОН, год выпуска — 1999, регистрационный знак — 0100 АО-1

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Начальная цена, руб. (без учета НДС)** | **8 000,00** | **Размер задатка, руб.:** | **800,00** |

**Местоположение объекта:** 224030, г. Брест, пр-т П. М. Машерова, 15. **Продавец:** ОАО "Туристический комплекс «Брест-Интурист", 224030, г. Брест, пр-т П. М. Машерова, 15, тел. 8(016)2221900. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП "Институт недвижимости и оценки", г. Брест, ул. Наганова, 10-329, т/ф 8(016)2408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. Срок возможного отказа от проведения аукциона: не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона.

**Аукцион состоится 25 марта 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329, в рабочие дни — с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений — 24 марта 2025 г. до 17.00**

# У РАБОЦЕ ТАЛАКОЙ — ЯК РЫБЫ Ў ВАДЗЕ



## За прыкладамі вясковага крэатыву — на Добрушчыну

**Цэнтр гэтага маляўнічага рэгіёна — Добруш — часта называюць маленькай беларускай Венецыяй: горад вады і мастоў. Ды на Добрушчыне не толькі ў райцэнтры, але і ў сельскай мясцовасці ёсць чым прывабіць турыстаў... Гэта справамі даказваюць актывісты-вяскоўцы, якія актыўна заняліся добраўпарадкаваннем водных аб'ектаў, тэрыторый вакол іх, стварэннем зон адпачынку і правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў. Дапамагае ўвасабляць у жыццё гэтыя ідэі — удзел у конкурсе праектаў грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў.**



Было.



Стала.

Сярод прыкладаў — ажыццяўленне грамадзянскай ініцыятывы жыхароў Ленінскага сельсавета Добрушскага раёна. Дзякуючы прызавым сродкам ад перамогі ў конкурсе ў 2022 годзе, выратавалі ад запусцення, ачысцілі, зарыбілі адзіны вадаём у аграгарадку Леніна — сажалку Сізаўка. Добраўпарадкавалі і тэрыторыю вакол яе. Каля пяці тысяч рублёў асобна сабралі вяскоўцы і сваімі сіламі заклалі фруктовы сад каля вадаёма, устанавілі малыя архітэктурныя формы. Велічны камень і скульптуру «Капітан карп», драўляную альтанку ў старажытным стылі вырабіў мясцовы майстар народных рамёстваў Валерый Мінкоў. Цяпер штогод тут арганізуюць конкурс юных рыбакоў-жыхароў Ленінскага сельсавета. Добраўпарадкаваная тэрыторыя — любімае месца правядзення Дня вёскі.

Як расказаў **старшыня Добрушскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір МАЛІНОЎСКІ,** у мінулым годзе адным з пераможцаў конкурснага адбору праектаў грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў стала ініцыятыва жыхароў Рассветаўскага сельсавета. За прызавыя сродкі і ўласныя сродкі мясцовых жыхароў на працягу мінулага года ў вёсцы Мар'іна добраўпарадкавалі вадаём «Барыня». Былое зарослае, непрывабнае некалі месца ўвогуле не пазнаць: высадзілі вакол вішнёвы сад, туі, устанавілі альтанкі.

— Вельмі важкі ўнёсак і падтрымка жыхароў у гэтай грамадзянскай ініцыятывы старшыні Рассветаўскага сельвыканкама Таццяны Кручковай. Яна не дала згубіцца ў архівах пра гісторыю вёскі Мар'іна прыгожай старажытнай легендзе пра Барыню. Цяпер аб паданні пра паходжанне вадаёма расказваюць архітэктурныя формы, — патлумачыў Уладзімір Маліноўскі.

Актывісты Рассветаўскага сельсавета ўвогуле вельмі актыўна прапаноўваюць свае праекты на конкурсы грамадзянскіх ініцыятыў. Летась яны сталі аднымі з пераможцаў і атрымалі фінансавую падтрымку на добраўпарадкаванне трох дзіцячых гульнявых пляцовак у аграгарадку Ігаўка, пасёлках Рассвет і Залессе, на закупку сродкаў малой механізацыі для добраўпарадкавання тэрыторыі.

— Па выніках конкурснага адбору праектаў грамадзянскіх ініцыятыў, якія будуць рэалізаваны ў бягучым годзе, у ліку пераможцаў — ініцыятывы жыхароў Кармянскага і Баршчоўскага сельсаветаў, — з радасцю зазначыў лідар дэпутацкага корпуса раёна.

Праект жыхароў Баршчоўскага сельсавета — гэта добраўпарадкаванне вадаёма і тэрыторыі вакол яго ў аграгарадку Баршчоўка. Будзе створана прывабнае месца для правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў. Ініцыятыва актывістаў Кармянскага сельсавета — экскурсійны маршрут «Па святой зямлі Іаана Кармянскага».

— Ініцыяваў гэты праект калектыў Кармянскай сярэдняй школы. Асноўная ідэя — развіццё і ўдасканаленне існага турыстычнага маршруту, звязанага з імем святога, праведнага Іаана Кармянскага, гістарычных аб'ектаў, якія маюць асаблівае значэнне. Дзякуючы ініцыятыве турыстычным маршрутам змогуць прайсці як мага больш не толькі жыхароў Добрушскага раёна, але і госці з іншых раёнаў, абласцей, а таксама турысты блізкага і далёкага замежжа, — перакананы Уладзімір Маліноўскі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота Добрушскага раённага Савета дэпутатаў.**


**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**

информирует о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **РУП СГ-ТРАНС** (Продавец) на праве хозяйственного ведения

**Электронные торги состоятся 27.03.2025 г.**

**Лот № 1 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57453813. 2. Вагон-цистерна № 57453821.
3. Вагон-цистерна № 57456089. 4. Вагон-цистерна № 57458101.
5. Вагон-цистерна № 57464083.
Начальная цена без НДС – 205 824,00 руб.

**Лот № 2 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57455545. 2. Вагон-цистерна № 57455677.
3. Вагон-цистерна № 57455768. 4. Вагон-цистерна № 57459976.
5. Вагон-цистерна № 57460123.
Начальная цена без НДС – 205 808,00 руб.

**Лот № 3 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57453912. 2. Вагон-цистерна № 57459760.
3. Вагон-цистерна № 57460115. 4. Вагон-цистерна № 57463978.
5. Вагон-цистерна № 57464117.
Начальная цена без НДС – 205 584,00 руб.

**Лот № 4 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57455610. 2. Вагон-цистерна № 57455909.
3. Вагон-цистерна № 57459703. 4. Вагон-цистерна № 57462509.
5. Вагон-цистерна № 57463788.
Начальная цена без НДС – 205 680,00 руб.

**Лот № 5 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57453714. 2. Вагон-цистерна № 57453854.
3. Вагон-цистерна № 57454233. 4. Вагон-цистерна № 57462483.
5. Вагон-цистерна № 57462657.
Начальная цена без НДС – 205 872,00 руб.

**Лот № 6 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57454001. 2. Вагон-цистерна № 57455354.
3. Вагон-цистерна № 57455800. 4. Вагон-цистерна № 57462517.
5. Вагон-цистерна № 57463887.
Начальная цена без НДС – 205 656,00 руб.

**Лот № 7 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57455313. 2. Вагон-цистерна № 57455859.
3. Вагон-цистерна № 57462574. 4. Вагон-цистерна № 57462988.
5. Вагон-цистерна № 57463804.
Начальная цена без НДС – 205 544,00 руб.

**Лот № 8 в составе:**
1. Вагон-цистерна № 57456113. 2. Вагон-цистерна № 57457103.
3. Вагон-цистерна № 57458572. 4. Вагон-цистерна № 57461253.
5. Вагон-цистерна № 57462608.
Начальная цена без НДС – 205 584,00 руб.

Модель вогонов-цистерн: 903Р.

Яна ўмела быць пераканаўчай. Бывала, прыедзем у калгас, а там цёпла прымалі Цярэшку Калабка ці дзеда Цыбульку («Таблетка пад язык»), моцна смяяліся. А пасля да Лідзіі Іванаўны прыходзілі за заслону бабулі: «Стань ты ў нас старшынёй!..» Пасля таго як пабачылі ў спектаклі, дзе яе пыталі: «А што ты рабіла пры акупацыі?» — «Ах, што я рабіла?» — і ў наступным выхадзе з'яўляецца ў парадным пінжаку з ордэнамі: «Во, што я рабіла!..» Як да такіх выпадкаў ставіцца? З удзячнасцю: значыць, глыбока кранула. Чалавека зачапіць можна толькі сцэнічнай праўдай.

У нашым тэатры было так: калі акцёр выйшаў, то ён ведае, навошта. Галоўнай была дакладная думка, а яе забяспечвала канкрэтнае дзеянне. Можна было выручыць спектакль, калі нехта захварэў, можна было ўвесці іншага артыста, і ён іграў, што трэба... А бываюць такія майстры на ўводы, як Сцяпан Сцяпанавіч Бірыла. Едзе на выязны граць п'есу, якую яшчэ нават не чытаў. Тут чытае, тут грае ў карты, але выходзіць — і працуе. А ёсць такія акцёрскія індывідуальнасці, якім трэба было падрабязна растлумачыць, што ў яго за персанаж. Павел Кармунін прыехаў з Татарстана. Помню, як ён з акцэнтам, падобным на грузінскі, казаў «каханенькі-родненькі». Першая яго роля была ў спектаклі «Я, бабуля, Іліко і Ларывон». Як з грузінскім акцэнтам навучыўся, так і ў іншыя ролі яго дадаваў. Аўгуст Мілаванаў першы гэта заўважыў і аднойчы яму таксама нешта адказаў з грузінскім акцэнтам. Было такое недзе на выездзе...

***— Што для вас паняцце «купалавец»?***

— У мяне ёць разуменні і ўяўленні, але ж яны не заўсёды могуць быць выкананы, бо я памятаю найлепшыя ўзоры, найлепшых акцёраў. Калі ў спектаклі ёсць дакладная думка — тое, чаго без добрага рэжысёра не атрымаецца. Таксама важна ўмець перадаць адчуванне, што гэта адбываецца сёння, тут, зараз, упершыню — таксама нехта павінен накіраваць. Калі не жывуць, а граюць, калі не змаўкаюць, а нямеюць, калі не здзіўляюцца, а агаломшваюцца — вось такое месцамі я бачыў у гэтым тэатры. Раней, і не з маім удзелам. Гэта калі вобразна.

***— Вы атрымалі званні народнага артыста Беларусі і народнага артыста СССР. Ці паўплывалі яны на творчы імпэт?***

— Яны ўплываюць хіба што на тое, што цябе абслугоўвалі ў лечкамісіі... А потым жыццё і праца ідуць далей. Уладзімір Іосіфавіч Уладамірскі быў увесь у ордэнах. Карыфей, стаў другім пасля Галубка народным артыстам БССР яшчэ да вайны, а пасля і званне народнага артыста СССР атрымаў. Хадзіў важна, з палкай — яна ў яго была з адметнай загнутай ручкай з сабакам наверсе. Вось гэта ішоў артыст!.. А я цяпер іду, нібыта Аркашка з «Лесу» Астроўскага: бярэцік — і наперад. Раней былі артысты — дык артысты! Глядзеў на іх і разумеў, што тэатр — гэта напраўду храм. І калі ты ў ім, то трэба не проста служыць, а «свяшчэннадзейнічаць».

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

*Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by*

# ЗЛАМАЎСЯ ГЕН?

## Генетык пра новыя даследаванні і скрынінгі, якія дапамогуць выяўляць захворванні яшчэ ў эмбрыёна



Генетычная паталогія альбо перадаецца ў спадчыну ад аднаго з бацькоў, альбо мутацыя ўзнікае ў палавой клетцы аднаго з бацькоў выпадковым чынам. Як выяўляць такія станы? Аказваецца, генетыкі даўно працуюць над тым, каб знаходзіць мутацыі яшчэ ў эмбрыёна. У некаторых выпадках іх можна своечасова «выправіць» падчас цяжарнасці, і ніякіх праяў складанага захворвання ў нованароджанага не будзе. Чаму ўзнікаюць спадчынныя захворванні і ці можна сёння іх вылечыць? Ці вінаваты ў гэтым бацькі і ці варта праходзіць генетычныя тэсты? Якія магчымасці для цяжарных жанчын хутка з'явяцца ў Беларусі, расказала доктар медыцынскіх навук, прафесар, загадчык лабараторыі медыцынскай генетыкі і маніторынгу прыроджаных парокаў развіцця РНПЦ «Маці і дзіця», галоўны пазаштатны спецыяліст па медыцынскай генетыцы Міністэрства аховы здароўя Беларусі Аксана ПРЫБУШЭНЯ.

### Скрынінг на СМА

Скрынінг на такое складанае генетычнае захворванне, як спінальная мышачная атрафія (СМА), плануюць укараніць у нашай краіне.

— Гэта тое захворванне, пра якое вельмі шмат цяпер гавораць. У тым ліку праз дабрачыннасць сем'і атрымліваюць дапамогу па лячэнні такіх дзяцей, — адзначыла Аксана Прыбушэня, дадаўшы, што лекі ад гэтага захворвання вельмі дарагія і яго скрынінг плануецца ўкараніць у Беларусі.

У выпадку калі такі пілотны праект будзе ўкаранёны, гэта дазволіць пачынаць лячэнне такіх дзяцей літаральна ў першыя месяцы, а значыць, атрымліваць выдатны эфект. Акрамя таго, у Беларусі працягваецца пілотны праект па выяўленні прыроджанага імунадэфіцыту.

### Новы падыход да выяўлення спадчынных хвароб

Плануецца ўкараніць і новы падыход да скрынінгу спадчынных захворванняў.

У прыватнасці, гэта скрынінг цяжарных на выяўленне храмасомных манагенных захворванняў — неінвазіўнае прэнатальнае тэсціраванне. Паводле слоў Аксаны Прыбушэні, на першым этапе яно можа быць выбарачнае, селектыўнае. Аднак ідэальны варыянт — у будучым прымяняць гэты метад даследавання да кожнай цяжарнай жанчыны.

На сёння гэта дарагі метад, але ён павінен і будзе таннець з кожным годам. Методыка дазволіць выяўляць захворванні ў плода па аналізе крыві, узятай у цяжарнай жанчыны. Дзякуючы гэтаму не будзе неабходнасці выконваць вялікую колькасць такіх інвазіўных працэдур, як амніяцэнтэз, якія выклікаюць асцярогі ў сям'і, паколькі звязаны з рызыкай выкідыша.

### Вызначаць храмасомныя анамаліі эмбрыёнаў

Будуць праводзіць у РНПЦ «Маці і дзіця» і пілотныя даследаванні па прэімплантацыйным генетычным тэсціраванні, якое дазваляе выяўляць генетычныя анамаліі ў эмбрыёнаў. Як адзначыла Аксана Прыбушэня, РНПЦ «Маці і дзіця» вядзе вялікую праграму па бясплатным экстракарпаральным апладненні.

— На якой платформе, у якім варыянце гэта будзе выкарыстана, які эканамічны пралік гэтага метаду даследавання будзе, на сёння гаварыць, напэўна, яшчэ заўчасна, — сказала яна.

У планах і скрынінгі з выкарыстаннем малекулярна-генетычных метадаў.

— Вядома, мы марым аб магчымасці выяўлення малекулярна-генетычнымі метадамі гетэразіготнага носьбіцтва найбольш частых мутацый. На сёння сем'і самі звяртаюцца з пытаннем, якія мутацыі яны носяць і якія могуць рэалізавацца ў патомства. Але ідэальны варыянт, калі б мы маглі вызначыць найбольш частыя захворванні, напрыклад фенілкетанурыю, і падобныя мутацыі ў цяжарнай на першым этапе, калі яна скрыніруецца, — адзначыла генетык.

Перспектыўным магло б стаць выяўленне гетэразіготнага носьбіцтва спінальнай мышачнай атрафіі ў цяжарнай у 11 тыдняў, а не ў нованароджанага. Такі падыход забяспечыў бы не толькі своечасовы пачатак лячэння дзіцяці, але і прадухіленне нараджэння такіх дзяцей.

У цэлым генетыка развіваецца вельмі хутка, з кожным годам з'яўляюцца ўсё новыя метады. І тут важна знаходзіць залатую сярэдзіну паміж магчымасцямі сучасных метадаў і іх рацыянальнасцю і мэтазгоднасцю.

### Чаму нараджаюцца хворыя дзеці?

У тым, што ў здаровых бацькоў часам нараджаюцца хворыя дзеці, нельга нікога вінаваціць, лічыць генетык.

— Што б ні адбылося, нават у выпадку нараджэння хворага дзіцяці, слова «вінаваціць» не можа прымяняцца да бацькоў. Калі гаварыць аб частаце і структуры парокаў, то большая частка — дзве трэці — гэта захворванні, парокі, якія ўзнікаюць выпадкова, і яны ніяк не звязаны з носьбіцтвам той ці іншай мутацыі ў сям'і, — адзначыла Аксана Прыбушэня.

Паводле яе слоў, захворванні, якія звязаны з сямейнай гісторыяй, па большай частцы перадаюцца аўтасомна-рэцэсіўна. Гаворка ідзе аб сітуацыях, калі зусім здаровы чалавек, носьбіт рэцэсіўнай, умоўна слабой мутацыі сустракае партнёра з такой жа мутацыяй. У 25 % выпадкаў у дзіцяці рэалізуецца канкрэтнае захворванне. Так з'яўляецца асноўная колькасць метабалічных хвароб, у тым ліку фенілкетанурыя, якая часта сустракаецца ў Беларусі.

Увогуле ж кожны здаровы чалавек з'яўляецца носьбітам ад трох да дзевяці мутацый.

— Мы не можам меркаваць і загадзя ведаць, якую мутацыю ўжо носіць наш партнёр, за выключэннем тых выпадкаў, калі ў шлюб уступаюць сваякі. Колькасць агульных генаў у іх вялікая, і большая верагоднасць атрымаць дзіця з такім тыпам захворвання. Менавіта таму родаснасныя шлюбы — гэта нядобра і ў многіх краінах яны забаронены, — адзначыла генетык.

Пры жаданні на этапе планавання цяжарнасці сям'я можа прайсці тэсціраванне на найбольш частыя для папуляцыі захворванні. Аднак большасць людзей да такіх метадаў не звяртаецца. Да таго ж рэцэсіўных захворванняў вялізная колькасць, іх усе знайсці немагчыма, заўважыла ўрач.

У плода могуць быць і спантанныя мутацыі. Прадухіліць іх немагчыма. Але прырода прадумала механізм прафілактыкі нараджэння такіх дзяцей — самаадвольны выкідыш. Амаль 80 % цяжарнасцяў, якія заканчваюцца такім спосабам у першым трымесцтры да 12 тыдняў, нясуць паталогію ў плода.

**Алена КРАВЕЦ.**

**У тэму**

### Замежнікаў прываблiваюць не толькі цэны, але і якасць медпаслуг

Высокатэхналагічная медыцынская дапамога, а таксама суадносіны цаны і якасці аказання паслуг прыцягваюць у нашу краіну ўсё больш медыцынскіх турыстаў. Летась па медыцынскую дапамогу ў Беларусь прыехала 160 тысяч замежных грамадзян са 159 краін свету. У 2023 годзе такіх турыстаў было 134 тысячы. Такім чынам, іх колькасць за мінулы год вырасла адразу на 20 %.

Часцей за ўсё па лініі медыцынскага турызму ў Беларусь прыязджаюць з Расіі, Кітая, Казахстана, Узбекістана, Туркменістана, Малдовы, Арменіі, Грузіі, Сірыі, Германіі, ЗША, Ізраіля, Італіі. Больш за 60 % ад колькасці пацыентаў прыпадае на краіны СНД. Па выніках 2024 года, рост экспарту медыцынскіх паслуг склаў больш як 10 %.

Найбольш папулярнымі кірункамі медыцынскага турызму з'яўляюцца транспланталогія, анкалогія, кардыяхірургія, пластычная хірургія, акушэрства, нейрахірургія, траўматалогія, дыягнастычныя абследаванні, прафілактычнае лячэнне, аднаўленне пасля перанесеных захворванняў, афтальмалогія, а таксама адпачынак у аздараўленчых комплексах.


**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении 25 марта 2025 г. в 10.00 открытого аукциона по продаже автомобиля BOGDAN 231010-31, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гомельстекло» на праве собственности**

| № лота | Наименование и характеристика объекта | Начальная цена, рублей (в т. ч. НДС 20%) | Задаток, рублей (в т. ч. НДС 20 %). |
|---|---|---|---|
| 1 | **Автомобиль BOGDAN 231010-31,** регистрационный знак АМ 2488-3, 2010 года выпуска. Тип: грузовой фургон. Цвет: белый. Номер кузова (рамы) Y6L231010AL200219. Объем двигателя: 1597 см³. Вид топлива: бензин. Коробка передач: механическая. | **8 760,00** | **900,00** |
| **Местонахождение автотранспортного средства:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25 | | | |

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артёма, 23, 2-й этаж, каб. 2-6,** по рабочим дням – с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00, **по 24.03.2025 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **25.03.2025 г**. Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного документа с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть и при себе иметь все данные по счету.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY49AKBB30120000101350000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, БИК AKBBBY2X. Получатель платежа – Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». УНП 401166490. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению, в газете «Звязда» от 19.02.2025 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона (лицами, приравненными к победителям), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 5 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в течение 10 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке.

**Организатор: Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 (232) 32-46-47, 32-18-95; +375 (29) 170-46-47. сайт: ino.by • e-mail: auction-gino@gino.by**
**Продавец: ОАО «Гомельстекло», г. Гомель, ул. Михаила Ломоносова, 25, тел.: +375 (29) 615-55-20; +375 (29) 171-07-69.**



**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки)**
извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Недра Нежин»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 25.03.2025 г.**

Лот № 1: TOYOTA LAND-CRUISER 200

кузов (рама) № JTMHX05J804016942. Начальная цена с НДС 20 % – 74 640,00 руб. Задаток – 7 464,00 руб.

Местонахождения: Минская область, Любанский район, с/с Реченский, д. 18 (4000 м. юго-восточнее д. Обчин).

**Шаг электронных торгов** – 5 %.
Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: 20.03.2025 г. в 16.00.

**Организатор электронных торгов:**
**8 (017) 324-70-57;**
**8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52; torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

# ПОЛЬШЧА ЧАДЗІЦЬ...

## Карта забруджвання паветра ў нашай заходняй суседкі — адна суцэльная чырвоная зона



**Прычына простая: з надыходам маразоў вугальныя электрастанцыі Польшчы забруджваюць выхлапамі ўсё вакол, не даючы прадыхнуць ні сабе, ні «зялёным» суседзям. Нямецкія палітыкі ўжо абвінавачваюць польскі ўрад у невыкананні дырэктыў ЕС. Але лягчэй (у тым ліку і дыхаць) ад гэтага не становіцца.**

Разам з маразамі ў Польшчу прыйшоў атрутны смог. Узровень забруджанасці паветра ў краіне значна перавысіў нормы. Пра гэта паведамляе БелТА са спасылкай на польскія СМІ. З-за пахаладання палякі сталі выкарыстоўваць незаконныя печы і абаграваць свае дамы вуглем.

Так, 17 лютага ў Варшаве і ваколіцах былі зафіксаваны шматразовыя перавышэнні нормаў узроўню забруджанасці паветра. Тэмпература ў польскай сталіцы ўначы апусцілася да мінус 10 градусаў. Гэта адразу адбілася на паказчыках забруджвання паветра.

Праблема ахоплівае ўсю Польшчу. З вечара 16 лютага карты вымярэнняў якасці паветра пачалі свяціцца чырвоным. У некаторых рэгіёнах сістэма абвесткі насельніцтва пра пагрозы alert RCB выпусціла папярэджанні аб рэзкім пагаршэнні якасці паветра.

Як адзначала раней выданне Krakow.wyborcza, у Польшчы налічваецца больш як 3 мільёны печаў, і ў іх па-ранейшаму паляць не толькі вугаль, але і вугальныя адходы, а таксама смецце. У выніку над Польшчай вісяць карычневае воблака, якое змяшчае таксічны кактэйль з пылу, цяжкіх металаў, злучэнняў серы і азоту.

Самымі забруджанымі гарадамі, як паказвае Krakow.wyborcza, з'яўляюцца Кракаў, Познань, Вроцлаў і Варшава.

Якасць паветра ў гарадах з'яўляецца адной з асноўных праблем навакольнага асяроддзя і аховы здароўя, з якой сутыкаецца Польшча. Як перадавала агенцтва РІА «Новости», крытыка з боку еўрапейскіх экалагічных арганізацый, рэгулярны смог і рост колькасці пацыентаў з лёгачнымі захворваннямі вымушаюць польскія ўлады скарачаць выкарыстанне вугалю ў энергетыцы. Так, жыхарам Варшавы з 2023 года забаранілі ацяпляць дамы вугалем і выкарыстоўваць несертыфікаваныя ацяпляльныя прылады. Але, мабыць, многія палякі ўсё яшчэ карыстаюцца печамі. У Варшаве і навакольных муніцыпалітэтах дагэтуль працуе больш за 40 тысяч старых печаў, іх часта пакідаюць як рэзервовую крыніцу цяпла.

### ...І АТРУЧВАЕ ГЕРМАНІЮ

З праблемай забруджанасці паветра сутыкнулася і Германія. Нямецкія эксперты не сумняваюцца, што значная частка гэтага чаду прыйшла да іх з Польшчы.

Да іх таксама далучаюцца палітыкі, якія заклікаюць палякаў адысці ад вугальных электрастанцый. Ужо некалькі дзён Федэральнае агенцтва па навакольным асяроддзі (UBA) паведамляе аб высокім узроўні забруджвання паветра, што захоўваецца амаль па ўсёй Германіі.

— Каля 50 % цвёрдых часціц у Берліне ў цяперашні час прыпадае на Польшчу, 12 % — на Германію, — паведаміла кіраўнік аддзела ацэнкі якасці паветра UBA Утэ Даўэрт, словы якой прыводзіць Bild.

UBA таксама апублікавала абноўленую карту забруджвання паветра над Германіяй. Карта паказвае, што ў мінулую пятніцу канцэнтрацыя малекул PM 2,5 была настолькі высокай амаль ва ўсёй краіне, што практычна ўсе рэгіёны былі адзначаны чырвоным колерам. Яны абвінавачваюць палякаў у гэтым чадзе.

Нямецкія палітыкі не засталіся ўбаку ад абвінавачванняў Польшчы як крыніцы атручвання паветра.

Міністр навакольнага асяроддзя Ніжняй Саксоніі Крысціян Мэер абвінаваціў польскі ўрад у невыкананні дырэктыў ЕС.

— Кліматычныя мэты ЕС таксама дастасавальныя да Польшчы. Для чыстага паветра Польшча павінна выконваць правілы ЕС. Адмова ад вугалю, вырашаная ўрадам Туска ў 2024 годзе, павінна быць ажыццёўлена хутка, — падкрэсліў ён у інтэрв'ю Bild.

Міністр нагадаў, што ў Германіі кожны домаўладальнік павінен абсталяваць свой прыватны камін фільтрамі, інакш яго адключаць, у той жа час коміны ў Польшчы па-ранейшаму дымяць без перашкод.

А прэс-сакратар экалагічнай палітыкі парламенцкай групы ХДС/ХСС у Бундэстагу доктар Аня Вайсгербер заявіла, што міністру «не спадабаецца», як палякі плануюць замяніць свае вугальныя электрастанцыі.

— Планы ўключаюць будаўніцтва шасці атамных электрастанцый, — пракаментавала яна, спасылаючыся на адсутнасць планаў па ўкараненні «зялёнай энергіі».

## У тэму

### Электрадамы і менш выкідаў у атмасферу: чым БелАЭС выгадная для Беларусі

Не так даўно ў нашай краіне праходзіў форум «Атамная энергетыка: новыя магчымасці для інавацыйнага развіцця нацыянальнай эканомікі», на якім **намеснік міністра энергетыкі Дзяніс МАРОЗ** адзначыў, як з'яўленне Беларускай АЭС прынесла відавочную выгаду нашай краіне.

Ён растлумачыў, што БелАЭС забяспечвае каля 40 % унутраных патрэб краіны ў электраэнергіі. Калі да ўводу станцыі больш за 90 % электрычнай і цеплавой энергіі выпрацоўвалася на імпартаваным прыродным газе, то за кошт БелАЭС гэты паказчык знізіўся да 67 %.

З моманту ўключэння ў аб'яднаную энергасістэму першага энергаблока станцыя дазволіла замясціць 10 млрд куб. м прыроднага газу.

— Зніжэнне прыроднага газу ўплывае не толькі на забеспячэнне энергетычнай бяспекі краіны, але і на экалагічны складнік. Беларуская АЭС дазваляе скараціць выкіды ў атмасферу на 7 млн тон за год. Гэта досыць вялікая лічба, — прыводзіць БелТА словы намесніка міністра.

Для інтэграцыі станцыі ў энергасістэму краіны праведзена маштабная работа па мадэрнізацыі аб'ектаў энергетычнай галіны. Калі ў 2022 годзе энергазабяспечвальнымі арганізацыямі пабудавана і рэканструявана 1,7 тысячы км электрасетак, то ў 2024 годзе — каля 3 тысяч км. Па словах Дзяніса Мароза, гэтыя тэмпы будуць нарошчвацца.

Разам з электрасеткамі мадэрнізацыю прайшлі падстанцыі розных класаў напружання, у тым ліку лічбавыя. На 20 энергааб'ектах уведзены ў строй сучасныя электракатлы сумарнай магутнасцю 916 МВт. Яны актыўна выкарыстоўваюцца ў асенне-зімовы перыяд для вытворчасці цяпла пры ацяпленні буйных населеных пунктаў.

У Беларусі адзначаецца значны рост спажывання электраэнергіі. За 2024 год электраспажыванне перавысіла 43 мільярды кВт•г.

Як падкрэсліў Дзяніс Мароз, гэта абсалютны рэкорд. Пры гэтым прырост адбываецца па ўсіх сектарах эканомікі, а таксама ў насельніцтва. У краіне будуюцца сучасныя электрадамы.


## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов и земельных участков в частную собственность в Каменецком районе, Брестской области

| № лота | Наименование объекта/ Адрес участка | Кадастровый номер | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подготовке зем.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке, в т.ч. ограничения и условия в его использовании | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **д. Маковище,** 26 (площадь застройки 42 кв. м, готовность 10 %) и земельный участок | 124082007601000066 | 0,1128 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **2 650,11** (2 074,83 – не завершенный незаконсервированный жилой дом, 575,28 – земельный участок) | 530,00 | **3 066,18** | 0,1128 га – природные территории, подлежащие специальной охране (в охранных зонах Национального парка «Беловежская пуща») | газоснабжение, электроснабжение |
| 2 | не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом в **д. Маковище,** 26А (площадь застройки 42 кв. м, готовность 10 %) и земельный участок | 124082007601000067 | 0,1017 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | **4 077,81** (3 559,14 – не завершенный незаконсервированный жилой дом, 518,67 – земельный участок) | 800,00 | **2 984,98** | 0,1017 га – природные территории, подлежащие специальной охране (в охранных зонах Национального парка «Беловежская пуща») | газоснабжение, электроснабжение |
| **Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определённых Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220 и Указом Президента Республики Беларусь «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» от 05.05.2009 г. № 232 | | | | | | | | | **4 200,00 рублей** |

**Организатор аукционных торгов –** КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактные телефоны: 53 81 92.

**Задаток в размере до 20 % от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924, в срок до 16.00. 19.03.2025 г.**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразившие согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязаны внести:

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за право заключения договора аренды земельного участка), за вычетом суммы, причитающейся за незавершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные местным бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

• в течение 2 месяцев после внесения вышеуказанных платежей в установленном законодательством порядке осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав ограничений (обременений) прав на него;

• в течение одного месяца с момента осуществления государственной регистрации получить в установленном порядке техническую документацию на жилой дом и разрешение на его строительство;

• в течение одного месяца с момента осуществления государственной регистрации получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и строительство одноквартирного жилого дома и нежилых построек на придомовой территории на предоставленном земельном участке;

• разработать в установленном порядке проектную документацию на строительство одноквартирного жилого дома и согласовать ее;

• завершить строительство объекта в сроки, установленные действующим законодательством.

**Аукцион состоится 25 марта 2025 г. в 11.00 по адресу: Каменецкий район, г. Каменец, ул. Брестская, 9 (зал заседаний)**

**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30. 19.02.2025 г. до 16.00. 19.03.2025 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50-23. Контактные телефоны: 53 81 92.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.kamenec.brest-region.gov.by и www.gki.gov.by**

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## ХТО ЗАШМАТ ЖАДАЕ, той... дыплом атрымае

**Дадому Андрэй Пятровіч ехаў задаволеным: удалося такі вырашыць важнае пытанне, да таго ж — пятніца, наперадзе два выхадныя. Можна...**

Думкі аб тым, што можна будзе зрабіць, перарваў «чэл», які з цемры «вынырнуў» на дарогу, а потым, калі Пятровіч ужо затармазіў і ўдала яго абʼехаў, чамусьці заваліўся ў снег і не ўставаў. «Напэўна, п'яны?» — падумаў кіроўца і здаў назад.

— Э-э, уставай, — загадаў ляжачаму.

Той нават не падумаў.

— Кажы, дзе жывеш?

Мужчына штосьці памармытаў і назваў сваю вуліцу.

Ехаць да яе было не блізка, але ж Пятровіч зацягнуў п'янага ў машыну, давёз да дома, да дзвярэй пад'езда. А ўжо там націснуў кнопкі дамафона, сказаў (трэба разумець, жонцы?):

— Я тут гаспадара прывёз. Дык вы спусціцеся ўніз — дапамажыце...

— Ага, зараз! Я вам абодвум там памагу! — заявіла жанчына.

Вось гэтага Пятровіч чакаць не стаў: пакінуў мужчыну на лавачцы (тут не прападзе) і паехаў дадому, дзе яго на самым парозе сустрэў сын.

— Я на гэтым тыдні амаль выдатнік, — трымаючы ў руках разгорнуты дзённік, пахваліўся малы. — Давай 20 рублёў. Ты абяцаў.

— Ну, раз абяцаў, — пагадзіўся бацька...

Абмацаў адну кішэню, потым другую — ні дакументаў, ні грошай там не было.

Выйшаў на вуліцу, пашукаў у машыне, крутнуўся на тое месца, дзе падбіраў і высаджваў пасажыра — усё дарэмна.

— Прапаў бумажнік, — сказаў жонцы, вярнуўшыся дамоў.

— Болей п'яніц развозь — яшчэ і не тое прападзе, — пабяцала тая.

— Але ж чалавек... Зімой, на дарозе, — трымаўся свайго Пятровіч і ўжо думаў, як з панядзелка пачне спраўляць новыя дакументы.

А ў суботу ў хаце зазваніў тэлефон.

— Вы Андрэй Пятровіч? — удакладніла нейкая жанчына. — Я знайшла ваш бумажнік.

— Праўда?! — выгукнуў гаспадар. — Дзякуй!

— І што мне з вашай падзякі? Я з ёй у краму не схаджу... З вас 700 рублёў.

— Колькі-колькі? — перапытаў Пятровіч. — Ды пабойцеся Бога! У мяне двое дзяцей.

— Але ж вы, я ведаю, начальнік? — заявіла жанчына.

— Кату па пяту...

— Значыць, грошы павінны быць, — не слухала суразмоўніца.

— Ну, нейкай сумай я магу вам аддзячыць...

— Я сказала якой: семсот рублёў.

Пятровіч, мякка кажучы, вагаўся, а бабуля праз дзень ужо аб'явілася зноў:

— Што — пешшу на работу ходзіце? Грошай шкадуеце, хоць маглі б ездзіць, — кпіла яна ды яшчэ і з... сынком:

— Ты ката за хвост не цягні, — ужо ён павучаў Андрэя Пятровіча. — Маці грошы патрэбныя, а табе — дакументы. Значыць, плаці і забірай.

— Тады — праз два тыдні, — прапанаваў Пятровіч.

...Роўна праз два яму зноў пазванілі.

— Вы-такі гатовы забраць дакументы? — паблажліва спытала вымагальніца.

— Не, навошта? — адказаў мужчына. — Мне яны без патрэбы.

— Гэта як? — устрывожылася бабуля.

— А вось так: я новыя справіў, а вы, грамадзяначка, за тыя грошы, што знайшлі, купіце сабе вялікую рамку. Пакладзіце туды ўсе мае паперы і павесьце на сцяне. Будзе вам дыплом — за сквапнасць!

**Вольга Савасцюк,**
*г. Мар'іна Горка.*






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# СКАНВОРД




## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Па гарызанталі:** Цеціва. Пот. Гарнір. Ачаг. Частка. Наказ. Горб. Радар. Кураня. Джыцу. Кабура. Вушка. Арак. Накаўт. **Па вертыкалі:** Капыт. Чытач. Цягач. Ігнат. Аорта. Ага. Смага. Кодла. Клара. Збруя. Удава. Рыкша. Кукан. Рыбак. Ура. Нораў. Акт.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

## 19 ЛЮТАГА Даты Падзеі Людзі




**1577** год — нарадзіўся Мялецій Смятрыцкі, беларускі пісьменнік-палеміст, грамадскі і царкоўны дзеяч. Дзякуючы свайму бацьку-пісьменніку з ранняга дзяцінства знаходзіўся ў асяроддзі высокаадукаваных людзей. Пасля заканчэння Віленскай езуіцкай акадэміі Смятрыцкі доўгі час настаўнічаў, затым захапіўся прапаведніцтвам і пачаў пісаць палемічныя творы. У 1617 годзе ў Вільні ён прыняў пострыг. З таго часу Смятрыцкі пачаў сваю педагагічную дзейнасць, вынікам якой стала кніга, надрукаваная ў 1618 годзе, — «Граматыки словенские правильная синтагма», якую Міхаіл Ламаносаў называў «брамай сваёй вучонасці».

**1919** год — створаны Заходні фронт для барацьбы з польскімі войскамі (8 красавіка 1919 года пераўтвораны ў Заходнюю ваенную акругу).

**1937** год — 12-ы (надзвычайны) Усебеларускі з'езд Саветаў зацвердзіў Канстытуцыю БССР 1937 года і на яе аснове даручыў ЦВК БССР распрацаваць першае палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Савет БССР.




**1651** год — царкоўны раскол у Рускай праваслаўнай царкве. Звязаны з рэформай патрыярха Нікана, накіраванай на ўнясенне змяненняў у богаслужэбныя кнігі маскоўскага друку і некаторыя абрады ў мэтах іх уніфікацыі з тагачаснымі грэчаскімі. Рэформа ажыццяўлялася пры ўдзеле і падтрымцы цара Аляксея Міхайлавіча і некаторых іншых праваслаўных патрыярхаў, была адобрана і пацверджана пастановамі шэрагу сабораў, якія праходзілі ў Маскве ў 1650—1680-х гадах. Праціўнікі рэформы, з 1788 года афіцыйна званыя стараабраднікамі, былі аб'яўлены ерэтыкамі і аддадзены анафеме на Маскоўскім саборы 1656 года і на Вялікім Маскоўскім саборы 1666—1667 гадоў. У выніку з'явіліся стараверскія групы.

**1905** год — Руска-японская вайна: Мукдэнская бітва — найболей маштабная, працяглая па часе і самая кровапралітная бітва Руска-японскай вайны. Сумарныя людскія страты войск перавысілі 160 тысяч чалавек.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 384. Індэкс 63850. Зак. № 426.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 лютага 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12